

СІМБІЁЗ ШАНСОНА І БАЛАЛАЙКІ

ЧЫРВОНКА

ПРЫЦЯГАЛЬНАСЦЬ «ПУНСОВЫХ ПАГОНАЎ»

ЧЫРВОНКА




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

13 СТУДЗЕНЯ 2022 г. ЧАЦВЕР № 7 (29629)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Дзмітрый ПІНЕВІЧ, міністр аховы здароўя:**

*«Інфарматызацыя ўстаноў аховы здароўя палепшыць абслугоўванне пацыентаў. Яшчэ больш актуальным гэта стала падчас пандэміі, калі спатрэбілася павялічыць сацыяльнае дыстанцыраванне. Спецыялісты пачалі часцей кансультаваць у аддаленым доступе. Але гэта не галоўнае. Самае асноўнае — інтэграванне ўсіх інфармацыйных патокаў, даных аб кожным пацыенце ў адным месцы. Вельмі важны кампанент, перш за ўсё, для пацыента — гэта сэрвіс і паляпшэнне якасці аказання медпамогі. Сувязь усіх устаноў у адзінае цэлае і сістэм падтрымкі тэхнічных рашэнняў, калі да кожнага будзе доступ, да самых лепшых практык, — гэта самая асноўная задача, якая стаіць».*

# Прыцягненне Дугі



У Беларусі выяўлена пяць пунктаў геадэзічнай дугі Струвэ, якая цяпер у ахоўным Спісе сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Тры з гэтых пунктаў знаходзяцца ў Іванаўскім раёне — каля вёсак Ляскавічы, Шчакоцк і Асаўніца. Усе яны абазначаны аднолькавымі вышкамі-пірамідамі і мармуровымі помнікамі, за якія адказвае Рэспубліканскі камітэт «Дзяржкаммаёмасць», у прыватнасці, аддзел службы землеўпарадкавання і геадэзіі Іванаўскага райвыканкама. Начальнік аддзела Валянціна **БЫЧЫК**, якая па службе ведае кожны гектар раёна і часта аб'язджае тэрыторыю, любіць наведаць гістарычныя мясціны, у тым ліку і тыя, якія абазначаны помнікамі ЮНЕСКА. Здымак галоўнага раённага землямера зроблены якраз каля аднаго такога знака — паблізу вёскі Шчакоцк.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

- **Жалобныя мерапрыемствы, прымеркаваныя да гадавіны смерці ганаровага Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі Героя Беларусі мітрапаліта Філарэта, прайшлі ў Свята-Успенскім Жыровіцкім манастыры. Тут ушанавалі памяць мітрапаліта Філарэта, на яго магілу ўсклалі вянкі і кветкі. У мерапрыемствах прыняў удзел кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар Сергеенка.**
- Вялікі адкрыты дыялог з моладдзю «Сіла закона» пройдзе ў Мінску 14 студзеня.
- **«Віккру» плануе стварыць у Магілёве музей пошукавай работы моладзі.**

Нерухомасць

## РЫНАК АРЭНДЫ Ў ЧАКАННІ СТУДЭНТАЎ І СЕЗОННЫХ РАБОЧЫХ

### Ён будзе «спаць» практычна да вясны

**Пандэмія і закрытыя граніцы моцна ўдарылі па рынку арэнднага жылля галоўнага горада краіны. У пікавы момант сталіца пазбавілася 50—60 % кватэранаймальнікаў, рынак захлынуўся ад наплыву пустых кватэр, і цэны папаўзлі ўніз. Па словах экспертаў, у Мінску ў маі можна было зняць кватэру за 150 долараў у месяц. Вядома, гэта былі вельмі спецыфічныя варыянты, але раней такіх цэн не існавала ў прынцыпе.**



Актыўнасць па пошуку арэнднага жылля ў сталіцы і цяпер застаецца нізкай, і, па вопыце мінулых гадоў, гэтая тэндэнцыя захаваецца як мінімум ажно да пачатку лютага. Колькасць свабодных для засялення кватэр, наадварот, працягвае расці, але істотных змен у стаўках арэнды не адбываецца. На думку гаспадароў жылля, цэны і так упалі «ніжэй за плінтус».

СТАР. 4

Спажывец

## ГАНДЛЁВЫЯ СЕТКІ ЗРОБЯЦЬ СКІДКІ

### Слабаабароненыя катэгорыі насельніцтва змогуць купляць сацыяльна значныя тавары танней

**Міністр антыманапольнага рэгулявання і гандлю Аляксей БАГДАНАЎ і прадстаўнікі 16 буйных гандлёвых сетак падпісалі пагадненне аб зніжках на сацыяльна значныя тавары для слабаабароненых катэгорый насельніцтва, паведамляе БелТА.**

«Упершыню рэалізуем такое пагадненне, гэта агульны падыход дзяржавы і бізнесу па падтрымцы слабаабароненых катэгорый насельніцтва. За апошні час прадукты харчавання выраслі ў цане, сітуацыя па студзені паказвае, што кошт сельгаспрадукцыі і прадуктаў харчавання працягвае расці. Фактараў шмат. Насельніцтву трэба дапамагаць спраўляцца з гэтым, таму вырашылі, што на сацыяльна значныя тавары слабаабароненым катэгорыям насельніцтва будзе дадзена 10-працэнтная зніжка», — расказаў Аляксей Багданаў.

Сярод гандлёвых сетак, якія падпісалі пагадненне, — ТАА «Санта Рытэйл», ТАА «Еўрагандаль», ЗАТ «Дабраном» («Капеечка», «Маяк»), ТДА «Віталюр», ТАА «БелМаркетКампані», ЗУП «Белвілесдэн» («Гіпа»). Плануецца, што спіс крамаў, якія дадуць зніжкі на сацыяльна значныя тавары для слабаабароненых катэгорый насельніцтва, будзе пашырацца.

Паводле слоў **выканаўчага дырэктара Асацыяцыі рознічных сетак Наталлі ШАБЛІНСКАЙ**, каб рэалізаваць праект, праводзіліся глыбокія разлікі, аналізы і шматлікія кансультацыі. «Пачалі ладзіць акцыі з 2008 года, калі хацелі быць салідарнымі з пакупнікамі, імкнуліся даць ім магчымасць набыць тавар па зніжанай цане. Цяпер сітуацыя аналагічная. Мінулы год быў складаны, мы практычна не прырaслі ў даходах, страцілі ўдзельнікаў рынку, сярод іх засталіся толькі самыя моцныя, надзейныя і крэатыўныя. З імі і заключаем пагадненне. Спадзяюся, для слабаабароненых катэгорый грамадзян гэта стане магчымасцю набыць неабходны тавар з максімальнай зніжкай», — сказала яна.

ISSN 1990 — 763X

Тлумачым нюансы

**Наталля КАЧАНАВА:**

# «Людзі з цікавасцю вывучаюць прапанаваны праект Канстытуцыі»

**Старшыня Савета Рэспублікі сустрэлася з працоўным калектывам ААТ «Мінскі падшыпнікавы завод». Мэта візіту — абмеркаванне з завадчанамі змяненняў і дапаўненняў, якія прапануецца ўнесці ў абноўленую Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь. Гутарка прайшла ў фармаце дыялогавай пляцоўкі.**



Фота БелТА.

У размове з завадчанамі Старшыня Савета Рэспублікі паведаміла, што наведвае шмат розных прадпрыемстваў, але МПЗ — упершыню. Працягваючы тэму дзейнасці прамысловасці, Наталля Качанава акцэнтавала ўвагу на тым, што рашэнне кіраўніцтва краіны аб захаванні здабыткаў савецкага часу было правільнае.

— Тое, што мы пакінулі заводы, якія працавалі ў савецкі час, важна. Жыццё паказала: гэта падмурак нашай эканомікі. Тым больш мы валодаем добрымі кампетэнцыямі і спецыялістамі ў гэтай галіне, захавалі працоўныя калектывы, заработную плату, — падкрэсліла яна.

Спікер верхняй палаты парламента адзначыла, што з глыбокай павагай ставіцца да людзей, якія працуюць на прамысловых прадпрыемствах.

— Гэта цяжкая, няпростая праца. Мой бацька працаваў на такім жа заводзе, таму не па чутках ведаю аб складанасцях сферы, — згадала яна і падкрэсліла: — Людзі ў такіх месцах рукамі ствараюць карысць не толькі для сябе, але і для дзяржавы, народа.

Падчас гутаркі з людзьмі Наталля Качанава падрабязна расказала аб навацыях, якія змяшчаюцца ў праекце змяненняў і дапаўненняў Канстытуцыі. Таксама паведаміла аб дзейнасці шматлікіх дыялогавых пляцовак, якія акумулююць прапановы грамадзян па ўсёй краіне.

Гаворачы аб рабоце над праектам, Наталля Качанава заўважыла, што сенатары паглыблены ў гэтую дзейнасць. Адзначыла спікер і той факт, што працягвае працаваць грамадская прыёмная, якая створана пры Савеце Рэспублікі для абмеркавання змяненняў і дапаўненняў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, куды беларусы звяртаюцца па тлумачэнні і з прапановамі.

— Пытанняў шмат, але самае важнае — што людзі сапраўды зацікаўлены ў гэтым, — падкрэсліла спікер. — Яны з цікавасцю вывучаюць прапанаваны праект, уносяць свае прапановы і карэктывы.

— Сёння ўжо можна выразна ўбачыць артыкулы і пытанні, па якіх паступае больш за ўсё прапаноў. Па выніках тыдня мы яшчэ больш абагульнім, але ўжо вымалёўваюцца асноўныя пытанні, якія хвалююць грамадзян, — патлумачыла спікер і назвала асноўныя з іх.

Паводле яе слоў, многія прапановы звязаны з сацыяльнай падтрымкай і гарантыямі.

— Вядома, усё гэта застаецца нязменным, больш за тое: пытанні сацыяльнай абароны пашыраюцца: гэта падтрымка сем'яў, людзей з інваліднасцю, — падкрэсліла Наталля Качанава. — Многіх хвалюе артыкул аб тым, што шлюб — саюз паміж мужчынам і жанчынай. Гэта значыць, людзі выступаюць за захаванне традыцыйных каштоўнасцяў у нашай краіне.

Акрамя таго, кажа Старшыня Савета Рэспублікі, клопат пра здароўе таксама хвалюе грамадзян і агучваецца падчас сустрэч з сенатарамі.

— Дарэчы, людзі таксама прасілі прапісаць у Канстытуцыі забарону на прыватызацыю буйных горадаўтваральных прадпрыемстваў. Для многіх важна, каб заводы заставаліся ва ўласнасці краіны, — адзначыла Наталля Качанава.

Прапановы, якія паступілі ад грамадзян, будуць разгледжаны Канстытуцыйнай камісіяй і рабочай групай, падкрэсліла спікер.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

**Ігар СЕРГЕЕНКА:**

# «Шэраг прапаноў носіць даволі канструктыўны характар»

**У Гродне адбылася сустрэча кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Ігара Сергеенкі з актывам Гродзенскай вобласці. Тэма нарады — «Канстытуцыя. Абмеркаванне. Рэферэндум». У рабоце семінара прынялі ўдзел старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Каранік, старшыня абласнога Савета дэпутатаў Ігар Жук, памочнік Прэзідэнта Беларусі — інспектар па Гродзенскай вобласці Юрый Караеў, кіраўнікі гарадскіх і раённых выканкамаў, буйных арганізацый і прадпрыемстваў, прадстаўнікі структурных падраздзяленняў.**



Фота БелТА.

Як падкрэсліў у сваім выступленні Ігар Сергеенка, абстаноўка у краіне стабільная, людзей у асноўным клапоціць іх матэрыяльны дастатак, стабільная работа, добраўпарадкаваны быт і цэнатворанне. Разам з тым напярэдадні рэферэндуму многія цікавяцца і палітычным жыццём. Як паказаў аналіз нядаўняга сацыялагічнага даследавання, у рэферэндуме мяркуюць прыняць удзел 63 % апытаных. Амаль 60 % падтрымліваюць змяненні ў Канстытуцыі.

У цэлым цікавасць да праекта Канстытуцыі вялікая, зазначыў спікер. Аб гэтым сведчыць актыўнае абмеркаванне змяненняў і дапаўненняў у Асноўны Закон на інфармацыйных рэсурсах, дыялогавых пляцоўках, сустрэчы ў працоўных калектывах. Часта гучаць вострыя пытанні, якія носяць палемічны характар.

— Мы знаходзімся на этапе падрыхтоўкі рэферэндуму, які мае адбыцца ў лютым. Да гэтага часу неабходна падрыхтаваць канчатковы тэкст Канстытуцыі, сфарміраваць камісіі. Падрыхтоўчая работа вядзецца, яна не скончана, ідзе дапрацоўка канкрэтных артыкулаў. На сёння паступіла звыш пяці тысяч розных водгукаў, рэкамендацый, прапаноў. Уся работа вядзецца Цэнтрам прававой інфармацыі пад кіраўніцтвам Адміністрацыі Прэзідэнта. Шэраг прапаноў носіць даволі канструктыўны характар, літаральна на гэтым тыдні адбудзецца іх абагульненне. Мы бачым моманты, якія трэба будзе ўлічваць, а ад чаго, напэўна, і адмовіцца, — паведаміў у сваім выступленні Ігар Сергеенка.

Па яго словах, большая частка зваротаў прысвечана другому раздзелу Канстытуцыі, які датычыцца асабістых правоў і свабод грамадзян. Выклікаў палеміку раздзел аб сацыяльнай адказнасці грамадзян і ўнясенні пасільнага ўкладу ў развіццё дзяржавы і грамадства, а таксама меры па ўмацаванні ўласнага здароўя. Чамусьці многія бачаць у гэтай норме крок да платнай медыцыны, хоць сэнс тут зусім іншы: чалавек нараўне з дзяржавай павінен клапаціцца аб сваім здароўі.

Ігар Сергеенка станоўча ахарактарызаваў работу Гродзенскай вобласці ў падрыхтоўцы да важнай палітычнай кампаніі. Разам з тым заўважыў, што не варта фармалізаваць гэты кірунак, трэба выходзіць на абмеркаванне злабадзённых тэм, бо многіх цікавяць пытанні сацыяльных гарантый, сацыяльнай абароненасці, вытворчых праблем, грамадска-палітычнай абстаноўкі.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

Парламенцкі дзённік

# Новы пасол — новае дыханне адносінам

**Старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА сустрэўся з новым Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Індыі Алокам РАНДЖАНАМ ДЖА.**

Кіраўнік дыппрадстаўніцтва пачаў сваю работу ў канцы верасня, з чым яго павіншаваў Уладзімір Андрэйчанка і адзначыў, што Беларусь вельмі высока цэніць сяброўскія сувязі з Індыяй.

«Мы разглядаем развіццё нашага супрацоўніцтва з Індыяй як адзін з прыярытэтаў знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь у Азіі. Сёння Індыя — магутная, сучасная дзяржава з развітой эканомікай, вялікім рынкам, сур'ёзным навукова-прамысловым патэнцыялам. Пакуль нашы адносіны не вельмі значныя, але яны развіваюцца на прынцыпах роўнасці, даверу, павагі», — сказаў Уладзімір Андрэйчанка.

Ён заўважыў, што з апошніх кантактаў індыйскага прэм'ер-міністра і Прэзідэнта Беларусі прайшло шмат часу, і з'явіліся новыя тэмы для абмеркавання. Дэпутаты лічаць, што новы візіт прэм'ера Індыі Нарэндра Модзі ў Беларусі быў бы значным крокам ва ўзмацненні двухбаковых адносін. «Вельмі важна, каб гэты візіт адбыўся ў бягучым годзе, бо мы сёлета адзначаем 30-годдзе з устанаўлення дыпламатычных адносін», — заўважыў спікер ніжняй палаты парламента.

Уладзімір Андрэйчанка запрасіў у Беларусь і свайго індыйскага калегу. Па яго словах, парламентарыям дзвюх краін неабходна актывізаваць сваю работу ў міжпарламенцкіх арганізацыях. Гатовыя беларускія дэпутаты браць удзел і ў парламенцкім вымярэнні БРІКС.

Уладзімір Андрэйчанка таксама падкрэсліў важнасць развіцця гандлёвага ўзаемадзеяння, стварэння сумесных прадпрыемстваў і надання новага дыхання гуманітарнаму вымярэнню супрацоўніцтва.

Алок Ранджан Джа заўважыў, што асабістая сустрэча лідараў краін неабходная, але з-за ковіду кантакты абмежаваныя. «Як толькі сітуацыя палепшыцца ці, прынамсі, пачне паляпшацца, я даю слова, што асабіста буду прасоўваць пытанні візіту прэм'ер-міністра ў Беларусь», — сказаў пасол.

Кіраўнік дыппрадстаўніцтва дадаў, што ў хуткім часе ў ніжняй палаце парламента Індыі будзе сфарміравана група дружбы з Беларуссю, ужо вызначана колькасць парламентарыяў ад кожнай партыі, засталося толькі вылучыць канкрэтных асоб.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Аўстралія стала найбуйнейшым у свеце экспарцёрам звадкаванага газу

Летась яна абышла Катар, паводле даных Kpler, якая даследуе рынак.

Аб'ём экспарту аўстралійскага звадкаванага прыроднага газу (ЗПГ) склаў 80,23 млн тон супраць 77,63 млн тон у 2020-м. Катар заняў другое месца, экспартаваўшы 77,83 млн тон у параўнанні з 77,88 млн тон у папярэднім годзе.

ЗША замацаваліся на трэцім месцы па выніках трэцяга года запар. У 2019 годзе Штаты абышлі Малайзію. Аб'ём экспарту амерыканскага ЗПГ летась павялічыўся амаль удвая — да 70,43 млн тон з 47,35 млн тон у папярэднім годзе.

Амаль увесь аб'ём экспарту ЗПГ Аўстраліі прыпаў на краіны Азіі, за выключэннем пастаўкі 30 тысяч тон у Іспанію. Больш за ўсё аўстралійскі газ імпартавалі Кітай (31,86 млн тон) і Японія (27,39 млн тон).

## Штам «Дэльтакрон» можа мець лабараторнае паходжанне

Выяўлены нядаўна на Кіпры новы варыянт каранавіруса, які спалучыў мутацыі дэльта- і амікрон-штамаў, можа мець лабараторнае паходжанне, паведаміла РІА «Навіны». Аб з'яўленні новага штама COVID-19 стала вядома 8 студзеня. Прафесар Леонціас Кастрыкіс, кіраўнік лабараторыі біятэхналогій і малекулярнай вірусалогіі Універсітэта Кіпра, заявіў, што ў 25 узорах біяматэрыялу, атрыманых у 11 шпіталізаваных і 14 амбулаторных пацыентаў са станоўчым тэстам на COVID-19, выявілі каранавірус з мутацыямі абодвух тыпаў. Генетык з ЗША Дзмітрый Прус, у сваю чаргу, выказаў думку, што новы штам можа мець лабараторнае паходжанне: гэта значыць, ён мог з'явіцца ў выніку забруджвання. З ім згодныя і іншыя спецыялісты. У прыватнасці, Том Пікок, генетык з Imperial College у Вялікабрытаніі, адзін з адкрывальнікаў «Амікрона», напісаў у Twitter, што «кіпрскі «Дэльтакрон» — зусім відавочная кантамінацыя, паколькі паслядоўнасці не ўтвараюць кластар на эвалюцыйным дрэве». Генетык з Ізраіля Шай Фляйшон лічыць, што ўсе ўзоры «Дэльтакрона» — не звязаныя паміж сабой разнавіднасці «Дэльты».

## Шкілет дзесяціметровага іхтыязаўра знайшлі ў Вялікабрытаніі

У брытанскім графстве Ратленд выяўлены акамянеласці «марского дракона», які мог жыць больш за 90 мільёнаў гадоў таму, паведаміла «Бі-бі-сі». Іхтыязаўра выявілі падчас работ па добраўпарадкаванні вадаёма ў прыродным запаведніку Ратленд-Уотэр. Адзін з рабочых наткнуўся на акамянелыя астанкі невядомай істоты, пасля чаго на месца прыбылі палеантолагі. Даследчыкі прыйшлі да высновы, што косці належаць іхтыязаўру — цеплакроўнаму марскому драпежніку, які дыхаў паветрам, падобнаму на сучасных дэльфінаў. Іхтыязаўры маглі вырастаць да 25 метраў у даўжыню і жылі ад 250 да 90 млн гадоў таму. Для Вялікабрытаніі гэта самая вялікая знаходка такога тыпу.

# «Праект Канстытуцыі пранізаны духам беларускасці»

**Гэтым часам беларусы бяруць удзел у абмеркаванні праекта Канстытуцыі, які будзе вынесены на рэспубліканскі рэферэндум у наступным месяцы. Дыскусія на дадзеную тэму прадстаўлена і на старонках нашай газеты. Сваімі разважаннямі з чытачамі «Звязды» наконт зместу Асноўнага Закона краіны падзяліўся загадчык аддзела сацыялогіі дзяржаўнага кіравання Інстытута сацыялогіі НАН Беларусі, кандыдат філасофскіх навук, дацэнт Мікалай ШЧОКІН.**



***— Усебеларускі народны сход, згодна з праектам Канстытуцыі, стане новым прадстаўнічым органам народаўладдзя, які будзе іграць значную ролю ў дзяржаўным кіраванні. Яго функцыянал у некаторых момантах супадае з парламенцкімі і прэзідэнцкімі абавязкамі. На стадыі распрацоўкі Канстытуцыі эксперты імкнуліся пазбегнуць так званага двоеўладдзя пры наданні УНС канстытуцыйнага статусу. Ці ўдалося гэта распрацоўшчыкам? І ў шырокім сэнсе — навошта наданне УНС такога шырокага функцыянала?***

— Перш за ўсё, неабходна звярнуць увагу, што ўся Канстытуцыя пранізаная гістарычнай памяццю. Адсюль і вытокі Усебеларускага народнага сходу, і адказнасць за духоўныя арыенціры грамадства як з боку дзяржавы, так і з боку грамадзян. Другі вельмі важны складнік праекта — гэта Канстытуцыя будучыні. Яна сатканая з такіх вечных катэгорый каштоўнасцяў, як сумленнасць, годнасць, шчырасць, адказнасць, міласэрнасць. Зыходзячы з гэтага, неабходна прызнаць: новая Канстытуцыя, верагодна, будзе першай у свеце, якую прыме «талака». Паняцце «талака» ўнікальнае ў тым, што яно пачынае набываць інстытуцыялізаваны характар. «Талака» і ёсць Усебеларускі народны сход. У праектах і шаблонах канстытуцый свету няма такога інстытуцыялізаванага згуртавання грамадзян, якое б вырашала пытанні.

У нас ужо было шэсць пасяджэнняў Усебеларускага народнага сходу. На працягу гадоў незалежнасці УНС прымаў стратэгічныя рашэнні. Пасля грамадска-палітычных падзей у 2020 годзе нам стала відавочна, што ў Канстытуцыі павінны быць прапісаныя збалансаваныя механізмы стрымлівання і процівагі, балансу дзяржавы і грамадства. У гэтым сэнсе УНС іграе ролю стратэгічнага характару.

Так, ёсць парламент, але частка грамадства застаецца за межамі абмеркавання пытанняў, якія прымаюцца на яго ўзроўні. А УНС будзе складацца з мясцовай вертыкалі ўлады (тых, хто не трапіў у парламент). Для кампетэнтнага рэгулявання заканадаўчых актаў там будуць і суддзі. Гэты орган ні ў якім разе не будзе функцыянальна дубляваць Палату прадстаўнікоў ці Савет Рэспублікі. Плюс ён прызваны не кантраляваць, а ўзаемадзейнічаць з органамі ўлады.

У нас застаецца заканадаўчая, выканаўчая і судовая ўлады. А УНС выявіць сабою своеасаблівага «калектыўнага прэзідэнта», «калектыўную свядомасць» грамадскай супольнасці. Выбірацца ён будзе на пяць гадоў, займее прэзідыум. Многія функцыі сходу будуць яшчэ вызначаны адпаведным законам.

Самая галоўная роля УНС — на ім у больш шырокім фармаце будуць даваць справаздачу прэм'ер-міністр, старшыні Савета Рэспублікі і Палаты прадстаўнікоў, іншыя кіраўнікі разнастайных дзяржаўных ведамстваў. У сходу будзе і заканадаўчая ініцыятыва. Усе законы будзе прымаць парламент, але з месцаў дэлегатам будзе лепш відаць, якія яшчэ прававыя акты неабходныя для вырашэння праблем.

Гэта новая сусветная практыка, таму пакуль узнікае шмат пытанняў наконт УНС. Я вылучаю **чатыры галоўныя складнікі, якія нясе ў сабе УНС. Першы — бяспека.** Калі ў дзяржаве адбываецца надзвычайная сітуацыя, УНС бярэ на сябе паўнамоцтвы па стабілізацыі сітуацыі ў краіне. **Другі — сацыяльная нагружанасць.** УНС будзе выступаць гарантам сацыяльнай арыентаванасці дзяржавы. То-бок, усе законапраекты будуць праходзіць праз УНС. Дэлегаты могуць прыпыніць дзеянне закона, які супярэчыць Канстытуцыі. Гэта будзе голас народа. **Трэці — гуманістычная функцыя.** УНС — люстэрка грамадства, эфектыўнасці развіцця дзяржаўнага кіравання, узаемадзеяння грамадзян з уладай. **Апошні — сход забяспечыць празрыстасць кадравай палітыкі.** УНС будзе зацвярджаць суддзяў, членаў ЦВК. Гэта этап «чысткі» ў кадравай палітыцы. Кіраўнік дзяржавы аддае частку кадравай палітыкі УНС, верагодна, каб больш дасканала ўбачыць назначэнцаў. Дэлегаты з месцаў больш ведаюць жыццё і работу кадраў, якія прыязджаюць на дзяржаўныя пасады з рэгіёнаў.

***— Артыкул 15 новай рэдакцыі Канстытуцыі прадугледжвае тэзіс аб захаванні гістарычнай памяці пра Вялікую Айчынную вайну. Безумоўна, на фоне спроб іншага трактавання падзей 1940-х гадоў гэта немалаважны складнік законапраекта, але наколькі такая норма будзе актуальная для новых пакаленняў?***

— Дзяржава і грамадства існуюць толькі на аснове нейкіх каштоўнасцяў. Будзем шчырыя, на тэрыторыі Беларусі было шмат дзяржаўных утварэнняў, але адзінай дзяржавы, да апошніх часоў, на жаль, не было. Нормы, што прапісаныя ў 15-м і 54-м артыкулах Канстытуцыі, даюць магчымасць акумуляваць сувязь часоў і пакаленняў.

Мы сёння праходзім стадыю ўзмацнення і палітычнай нацыі, і беларускай дзяржаўнасці ў цэлым. Вялікая Айчынная вайна змагла 80 гадоў таму аб'яднаць нашу нацыю, таму мы замацавалі ў Асноўным Законе сваё дасягненне — Перамогу ў Вялікай Айчыннай вайне. Ні ў адной Канстытуцыі свету няма такога замацавання каштоўнасных арыенціраў сваёй гісторыі. Але ў кожнай нацыі ёсць інструментарый кіравання ментальнасцю і псіхалогіяй грамадства. Нашай краіне гэтага не хапала. Цяпер мы гэту ментальнасць інстытуцыялізуем праз УНС.

Пераемнасць пакаленняў заўсёды была самым цяжкім пытаннем у гісторыі. Адзінства беларускага народа, гістарычная памяць дае магчымасць акумуляваць усе дасягненні і ганарыцца падзеямі, якія былі і тысячу гадоў таму, і некалькі месяцаў. Гэта, на мой погляд, і ёсць пераемнасць. Вядома, тым, каму сёння 8-10 гадоў, складана растлумачыць, што такое Вялікая Айчынная вайна, але для нас галоўнае — зберагчы сябе ад небяспекі. У свеце каля 30 гадоў ідзе этнанацыянальная чыстка, знішчэнне генафонду нацый. На мой погляд, вузкія палітычныя колы калектыўнага Захаду вядуць палітыку па генацыдзе гістарычнай памяці і праўды. Наша Канстытуцыя ставіць заслон на імкненні прышчапіць нам сіндром вінаватага, незалежна ад таго, у чым нас абвінавачваюць. Нам няма ў чым каяцца, а калі і ёсць у нашай гісторыі нейкія чорныя плямы, мы самі з імі разбяромся.

***— Многія беларусы адзначаюць важнасць артыкулаў пра сямейныя традыцыйныя каштоўнасці, сацыяльную падтрымку сем'яў з дзецьмі, увагу да моладзі. Можна сказаць, што новая Канстытуцыя будзе больш «сацыяльная» ў параўнанні з цяперашняй?***

— Так, гэтая Канстытуцыя нават жорстка сацыяльна скіраваная. Мы асабіста прапісалі ўвагу да жыцця інвалідаў. У беларускім грамадстве заўсёды былі ў пашане маральныя і хрысціянскія каштоўнасці. У гэтай Канстытуцыі пазначана ўзаемная адказнасць грамадзяніна і грамадства перад дзяржавай. Кожны можа патрабаваць нейкую дапамогу, але павінен нешта і аддаць, падтрымаць дзяржаву ў адстойванні нейкіх інтарэсаў — культурных, рэлігійных, інтарэсаў бяспекі. Наша грамадства праяўляе мудрасць часта, але калі пытанні даходзяць да прававога рэгулявання жыццядзейнасці, мы пачынаем наракаць на дзяржаву, сістэму ўлады. Канстытуцыя ўпарадкоўвае нашу адказнасць, а дзяржава бярэ на сябе вельмі сур'ёзныя абавязацельствы. Асноўны Закон — гэта таксама форма выхавання: дзяржава выхоўвае грамадства, а грамадства — дзяржаву.

***— Навошта замацоўваць у Канстытуцыі адзіны дзень галасавання? У чым практычная і грамадская значнасць?***

— Галоўная прычына — эканамічная эфектыўнасць. Мала хто з нас задумваецца, колькі каштуе правесці выбары. У гэтым працэсе задзейнічана амаль 60 тысяч чалавек, абмяркоўваюцца пытанні аплаты іх працы, аховы тэрыторый, друку бюлетэняў, рэкламы. На гэта ідуць сотні мільёнаў долараў. Да таго ж адзіны дзень матывуе чалавека ісці галасаваць, дае магчымасць больш глыбока прааналізаваць свой выбар. Адзіныя выбары забяспечваюць магчымасць зразумець канву палітыкі краіны, убачыць стратэгію яе развіцця. Выбіраючы дэпутата, мы бачым толькі яго праграму. Калі мы выбіраем, напрыклад, Прэзідэнта і дэпутата, мы можам праводзіць аналіз іх пасланняў, супастаўляць і на гэтай аснове рабіць свой выбар.

***— Што б вы асабіста ўнеслі ў новую рэдакцыю Канстытуцыі?***

— Я заўсёды лічыў сябе «дзяржаўнікам», таму мне імпануюць у гэтай Канстытуцыі дзяржаўны падыход, моцная вертыкаль улады і вялікая ўвага да філасофіі чалавека — выхаванне, духоўныя каштоўнасці. Ад гэтага многія краіны адыходзяць, але менавіта на такіх асновах грунтуецца грамадства. Калі яно забывае свае карані, адразу краіна перастае жыць, знікае дух грамадства. Праект Канстытуцыі пранізаны духам беларускасці. Гэты дакумент дазволіць нам «беларусамі звацца» і не заблукаць сярод цывілізацый, суседзяў, застацца самімі сабою.

Над Асноўным Законам працавалі многія эксперты. Я бачу, што некаторыя папраўкі, пра якія я думаў, унесеныя. Тонкасцяў шмат. Я буду выкладаць іх у сваіх нататках на імя кіраўніка дзяржавы. З боку прафесіяналізму ў праекце не хапае лагічнай экспертызы. Напрыклад, нельга праз коску пісаць «грамадства», «дзяржава», бо грамадства — не зусім дзяржава. Больш карэктным будзе злучнік «і». Канстытуцыя патрабуе логіка-рытарычнага экспертнага шліфавання, каб не было магчымасці чапляцца і з боку логікі падаваць у суд на нейкія міфічныя правы. Канстытуцыя ўвабрала ў сябе філасофію права Сярэднявечча, філасофію Гегеля, некаторыя рэчы з Мантэск'ё.

Мы адныя з першых прапісваем у Канстытуцыі механізм зараджэння і развіцця грамадскай супольнасці. Да гэтага імкнецца ўвесь свет, кожная дзяржава хваліцца сваёй грамадскай супольнасцю, але не можа сказаць, што гэта такое. Я спадзяюся, што мы дзякуючы гэтаму закону адкажам, але такі складаны працэс зойме не адзін год. Дарэчы, дадзеная Канстытуцыя змяшчае дыялектыку традыцый і навацый. УНС — гэта традыцыі «талакі», а зыходзячы з прававой сістэмы сучаснага свету — і навацыя.

***— Як адаб'ецца рэформа Канстытуцыі на жыцці простага беларуса?***

— Усё, што прапісана ў праекце Канстытуцыі, зойме дзесяцігоддзі для рэалізацыі. Неабходна будзе прыняць каля 500 законаў, падзаконных актаў, пастаноўленняў, інструкцый. Мы нанава фарміруем, па сутнасці, сістэму дзяржкіравання, з вытрымкай і цярпеннем павінны дачакацца наладжвання гэтага механізму. Горш не стане, але ці стане лепш, — залежыць толькі ад нас. Сапсаваць можна нават самы выдатны дакумент, але ідэальных дакументаў няма.

Неабходна разумець, што гэта Канстытуцыя не толькі для нас, але і для нашых дзяцей. Менавіта яны праз пакаленне будуць адчуваць плён гэтага дакумента. Канстытуцыя шмат у чым апярэджвае час, і нам прыйдзецца пасля яе прыняцця мадэрнізаваць сваю свядомасць.

Канстытуцыя — гэта разнапланавы, глыбокі, шматузроўневы дакумент, своеасаблівы маніфест беларускай дзяржаўнасці. Я ўпэўнены, што людзі прыйдуць на рэферэндум і прымуць яе. Ды і сам факт рэферэндуму нясе ў сабе сімволіку, бо пакажа, што людзі гатовыя змяняць Канстытуцыю. Гэта кажуць і сацапытанні. Факт рэферэндуму прывядзе да прытомнасці многіх людзей. Адна справа — крытыкаваць, крычаць у сацсетках, а іншая справа, калі ты сам бярэш бюлетэнь і галасуеш. Калі ты прыходзіш на рэферэндум, гэта ўжо сведчыць, што табе неабыякавы лёс дзяржавы і ты ўласна бярэш на сябе адказнасць за яго.

**Марыя ДАДАЛКА.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

## «БЛІЦ» ДЛЯ МІКАЛАЯ ШЧОКІНА

***— Прэзідэнцкая ці парламенцкая рэспубліка?***

— Прэзідэнцкая.

***— Сям'я або дзяржава?***

— Будзе парадак у дзяржаве — будзе шчаслівая сям'я.

***— «Беларусь» або «Белоруссия»?***

— Радзіма.

***— Змест або форма?***

— Форма павінна адпавядаць сутнасці, а сутнасць — форме.

***— Навацыі або традыцыі?***

— Дыялектыка традыцый і навацый.

## ДАСЛОЎНА



**Першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Максім РЫЖАНКОЎ:**

«Хачу сказаць, што на працягу ўсёй гісторыі нашай незалежнай дзяржавы я не прыгадаю такога сапраўды ўсенароднага, шырокага абмеркавання шляхоў яе далейшага развіцця. У працоўных калектывах праходзяць шматлікія дэбаты, дыялогавыя пляцоўкі. Групы экспертаў ездзяць па краіне, сустракаюцца з людзьмі, размаўляюць, слухаюць меркаванні, абагульняюць прапановы. На сёння ўжо больш за 4,5 тысячы прапаноў толькі афіцыйна прыйшло ў Цэнтр прававой інфармацыі пры Адміністрацыі Прэзідэнта. І я хацеў бы заклікаць усіх жыхароў не саромецца ўносіць свае прапановы, каментарыі. Нават калі нешта не знойдзе адлюстравання ў новым праекце Канстытуцыі, усё гэта будзе ўлічана і выкарыстана ў іншых заканадаўчых актах».

**Калі ў вас з'явяцца меркаванні з нагоды праекта — пішыце ў рэдакцыю або непасрэдна ў арганізацыю, якая будзе акумуляваць і аналізаваць усе заўвагі і прапановы, — Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі. Можна скарыстацца электроннай поштай sbor@ncpi.gov.by; можна запоўніць электронную форму, якая маецца на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале па адрасе: https://sbor.pravo.by; можна даслаць па пошце на адрас: 220030, г. Мінск, вул. Берсана, 1А, НЦПІ, з пазнакай «Канстытуцыя».**

# РЫНАК АРЭНДЫ Ў ЧАКАННІ СТУДЭНТАЎ І СЕЗОННЫХ РАБОЧЫХ

## Свабодных кватэр больш чым дастаткова

У снежні здымныя кватэры ў Мінску шукалі трохі часцей, чым месяцам раней, аднак попыт застаецца нізкім. Нават у параўнанні з крызіснай зімой 2020 года бягучая колькасць пошукавых запытаў «зняць кватэру ў Мінску» ў канцы гэтага года ніжэйшая на 20 %.

У той жа час прапанова кватэр у арэнду на рынку сталіцы працягвае павялічвацца, хоць ужо павольней, чым летам. У цэлым за ўвесь снежань свабоднымі для засялення былі каля 12 тысяч кватэр, што на 3 % вышэй, чым за ўвесь кастрычнік. У найбольшай ступені за месяц вырасла колькасць аб'яў аб здачы ў арэнду адна- і двухпакаёвых кватэр — на 3,5 % у абодвух выпадках. Трохпакаёвых кватэр стала больш толькі на 1 %.

## Неістотнае зніжэнне ставак працягваецца з кастрычніка

На працягу мінулага года на рынку арэнды назіралася некалькі хваляў цэнавых змен. З пачатку года і да сакавіка стаўкі арэнды заставаліся нязменныя. У сакавіку пачаліся актыўныя продажы кватэр у новабудоўлях і на другасным рынку жылля. Гаспадары прададзеных кватэр са свайго жылля ўжо з'ехалі, а ў новае яшчэ не засяліліся па прычыне касметычнага рамонту чужых апартаментаў. У гэты час назіралася часовая актыўнасць кватарантаў. Дадзеная сітуацыя была гэтак нечаканай для рынку, што ён дазволіў стаўкам арэнды спыніцца. Але гэта быў кароткачасовы прыпынак.

Красавік, май і чэрвень сталі самымі «ціхімі» месяцамі года. У гэты час на рынак хлынула масіўная порцыя свабодных кватэр, а новыя кватаранты так і не прыйшлі. У ліпені — жніўні настаў час чарговай хвалі актыўнасці арандатараў пад назвай «студэнцкі ажыятаж». Верасень і кастрычнік рынак хутчэй выжываў, чым актыўна развіваўся. А апошнія месяцы года паніжаны попыт на кватэры прывёў да далейшага нязначнага зніжэння ставак арэнды.

## Замежнікі нам не дапамогуць

Як адзначаюць кіраўнікі агенцтваў нерухомасці, здаць кватэру па леташніх цэнах ужо не атрымаецца па прычыне нізкага попыту. Заявак на арэнду мала, пры гэтым прапанова толькі расце. У сувязі з пандэміяй і закрытымі граніцамі Мінск пазбавіўся істотнай долі арандатараў — тых, хто прыязджаў у сталіцу на вучобу або работу (а гэта каля 30 % ад усяго рынку).

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Прапанова ўжо перавышае попыт, і калі год-два таму зняць добрую кватэру ў Мінску была няпроста, то цяпер выбар вялікі.

Калі казаць аб бюджэтным сегменце, то кошты істотна знізіліся. Яшчэ год таму кватэры за 200—250 долараў ляцелі як гарачыя піражкі, зараз здаюцца з нацяжкай. За гэтыя грошы арандатары патрабуюць добрыя лакацыі, свежы рамонт, мэблю і тэхніку.

## Рэальны цэннік ужо такі

Паводле інфармацыйнага каталога найбуйнейшага агенцтва нерухомасці сталіцы, сярэдняя цана арэнды аднапакаёвай кватэры ў пачатку студзеня склала 220 долараў у эквіваленце. Сярэдні кошт рынкавай арэнды стандартных двухпакаёвых кватэр цяпер дасягае 270 долараў, а трохпакаёвых — 330 долараў у эквіваленце.

Ёсць у базе даных гэтага агенцтва сапраўды танныя жыллёвыя памяшканні, якія размешчаны ў прыгарадах сталіцы. У Міханавічах, у пасёлку Сокал і ў Бараўлянах можна знайсці прымальныя па цане, але слабыя па лагістыцы размяшчэння кватэры ў старых пяціпавярховых дамах усяго за 160—180 долараў.

Разам з тым зараз на сайце «Куфар нерухомасць» ёсць некалькі дзясяткаў прапаноў неліквідных, бюджэтных кватэр і ў Мінску, за якія просяць 180—190 долараў у эквіваленце. Як правіла, гэта маленечкія аднапакаёвыя «апартаменты» ў Шабанах у дамах маласямейнага тыпу (па 4—6 кватэр у тамбуры), а таксама ў Чыжоўцы і ў раёне па вуліцы Казінца (практычна пустыя або з вельмі старой мэбляй). Маласямейкі лёгка адрозніць. Звычайна гэта дамы з 9 паверхаў з сотняй кватэр, калідорным тыпам тамбура і маленькімі плошчамі самога жылля — ад 21 «квадрата».

## Брэст і Гродна — у тройцы наймацнейшых па цэнах

У рэгіёнах апошнім часам адзначаецца таксама павелічэнне колькасці пустога жылля, якое ўласнікі пачалі здаваць у доўгатэрміновую арэнду. Гэта былыя кватэры на суткі, попыт на якія ўпаў амаль у нуль. Яго значна менш, чым у Мінску, таму патаненне арэнды адбылося спачатку ў сталіцы, а потым перакінулася на рынкі ў абласных гарадах.

Практыка паказвае, што зняць кватэру ў Брэсце на працяглы тэрмін можна ў шырокім дыяпазоне цэн. На ўскраінах, у старым фондзе і без новага рамонту цэннік будзе значна дэмакратычнейшы, чым у абсталяваных усім неабходным кватэрах з рамонтам у цэнтральнай частцы горада. Усё залежыць выключна ад фінансавых магчымасцяў кватэранаймальніка і яго жыццёвых пераваг.

Бюджэтныя аднапакаёвыя кватэры без шыкоўнай мэблі пачынаюць выходзіць за рамкі 100 долараў. Праўда, варыянтаў па 90—95 долараў у эквіваленце не так ужо і шмат. Гэтыя кватэры-маласямейкі з агульнай плошчай да 21 квадратнага метра. У асноўным стандартныя невялікія кватэры здаюцца па 100—130 долараў.

Цэннік таннай двухпакаёвай кватэры пачынаецца ў горадзе над Бугам са 120 долараў, а сярэдняя цана такога жылля — 150 «зялёных» у эквіваленце. Трохпакаёвыя апартаменты здаюцца тут з вялікім скрыпам за 200 долараў, але сустракаюцца і варыянты за 140 долараў, у выпадку калі ў кватэры ніхто не прапісаны.

Праўда, у цэнтры горада добра абсталяванае жыллё прапаноўваецца ўжо па іншых цэнах. Адна- і двухпакаёвыя кватэры — 200—250 долараў, а трохпакаёвыя — і наогул за 300—350. Вось толькі ці здымаюць іх, вялікае пытанне.



«Здам аднапакаёвую кватэру ў цэнтры Гродна сямейнай пары (з дзецьмі або без) без хатніх жывёл і шкодных звычак. У кватэры добры рамонт, ёсць тэлевізар, убудаваная шафа і камод, прас, пральная машына, WiFi». Гэта тыповая аб'ява, якую бачыць кожны прыезджы ў гэты горад. Усё быццам бы зразумела, толькі цана на такую арэнду будзе нерэальна высокая (каля 300 долараў). На прасторах інтэрнэту можна адшукаць значна таннейшую.

Мінімальны цэннік у Гродне пачынаецца з 90 долараў. Праўда, маласямеек у абласным цэнтры паменш, таму кватэра з такой стаўкай — звычайная хрушчоўка без рамонту ў старой пяціпавярхоўцы. У асноўным невялікія кватэры прапануюцца за 100—120 долараў. Бюджэтныя двухпакаёвыя кватэры можна зняць за 140—170 долараў у эквіваленце.

Стандартная трохпакаёвая кватэра ў дзевяціпавярховым панэльным доме здаецца за 200 долараў.

## Віцебск і астатнія

Як вядома, у пачатку восені звычайна назіраецца ажыўленне на рынку арэнднай нерухомасці. А ў Віцебску ўпершыню за апошнія дзесяць гадоў яго не было. І адпаведна цэны засталіся на ўзроўні мінулых гадоў і нават злёгку «аселі». Гэта звязана з тым, што значна павялічылася колькасць прапаноў. Людзі, якія раней мелі свабодныя кватэры і не здавалі іх, пачалі гэта рабіць.

І цяпер у горадзе рынак арэнды ў поўнай меры задавальняе попыт. Хоць раней быў дэфіцыт арэнднага жылля. На рынак арэнды ўплывае і тое, што ў ВНУ горада навучаецца шмат замежных студэнтаў, якія інтэрнатамі не забяспечаны. І такія арандатары гатовы плаціць крыху больш.

Калі ў цэнтральнай частцы горада аднапакаёвыя бюджэтныя кватэры здаюцца за 100 долараў, то на ўскраіне цэннік на не зусім ліквіднае жыллё ўпэўнена пачынаецца з 80 долараў. Двухпакаёвыя кватэры прапануюцца ад 100 да 150 долараў, а трохпакаёвыя — каля 180—200 долараў.

Прыкладна такія ж цэны на здымнае жыллё і ў Гомелі. А ў Магілёве сярэдні цэннік яшчэ на 3—5 долараў ніжэйшы.

## Арэнда дзяржжылля

У Беларусі плануюць пабудаваць больш арэнднага жылля, якое дазволяць выкупляць жыхарам. Пра гэта днямі расказаў **міністр архітэктуры і будаўніцтва Руслан ПАРХАМОВІЧ.**

У міністэрстве плануюць рэзка нарасціць аб'ёмы будаўніцтва арэнднага жылля, бо далёка не ўсе могуць дазволіць сабе набыць кватэру. Таксама міністр лічыць, што жыць трэба ўсім, так што неабходна пабудаваць арэнднае жыллё, засяліць туды чалавека, а ён у адпаведнасці з даходамі будзе прымаць рашэнне: альбо працягваць арандаваць гэтую кватэру, альбо праз некаторы час яе выкупляць.

Для гэтага, па словах міністра, неабходна скарэкціраваць дзеючае заканадаўства ў частцы выкупу такіх аб'ектаў.

Дарэчы, летась было пабудавана 120 тысяч квадратных метраў арэнднага жылля. На погляд міністэрства, гэта вельмі мала. Таму гэтую лічбу трэба павялічваць у разы. «У нас такі настрой: выйсці па выніках пяцігодкі на 600 тысяч квадратных метраў у год як мінімум. Гэта датычыцца ў цэлым краіны, бо такія кватэры запатрабаваны не толькі ў Мінску, але і ў абласных і раённых цэнтрах», — заявіў Руслан Пархамовіч.

## Крыху асабістага

Аўтар гэтых радкоў 13 гадоў здымаў кватэру, а потым 12 гадоў ужо здаваў. Так што вопыт стасункаў са здымнымі кватэрамі маецца. Вось некалькі маіх парад.

Пячатка ў пашпарце не мае ніякага значэння. Учарашнія маладыя могуць сапраўды гэтак жа хутка разбегчыся, як і ажаніцца. Пытаца трэба, як доўга жылі разам. Калі ў пары за плячыма ёсць хоць бы год сумеснага жыцця, то ёсць шанц, што вам не прыйдзецца шукаць новых жыхароў ужо праз месяц пад касыя погляды суседзяў, якім давялося назіраць бурнае завяршэнне адносін.

Ніколі не здавайце кватэру сваякам, сябрам, знаёмым. Я наступіў на гэтыя граблі двойчы, і абодва разы гэта стала кропкай у адносінах з наступным спальваннем усіх мастоў.

Няма правіла «сямейныя лепш студэнтаў». У мяне было некалькі перыядаў, калі кватэру здымалі студэнты. Ні адзін не падвёў (калі не лічыць бруднай газавай пліты), а сем'і — 50 на 50.

Не варта шалёна гнацца за грашыма. Трэба быць чалавекам і шукаць адэкватных кватарантаў. Тады ўсім будзе шчасце.

**Сяргей КУРКАЧ.**

---

**• Дарэчы**

## Вось гэта прапанова!

### На сэрвісе арэнды жылля з'явілася прапанова пераначаваць у бункеры часоў халоднай вайны

Падземныя бункеры, якія сталі непатрэбнымі, пабудаваныя ў 1960—1970-я гады, цяпер часта трансфармуюць у жыллё. Уласны дом такога тыпу могуць дазволіць сабе нямногія, аднак магчымасць хоць бы на кароткі час адчуць сябе сведкам халоднай вайны ўсё ж такі ёсць. У амерыканскім Разуэле гаспадар аднаго з такіх сховішчаў здае яго ў арэнду, піша The Sun.

---

Тым часам

## Па праграме «Сямейны капітал»

**Для шматдзетных сем'яў на 1 студзеня 2022 года адкрыта 108 375 дэпазітных рахункаў «Сямейны капітал», з якіх па праграме 2020—2024 гадоў — 25 896, паведамілі БелТА ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны.**

Па праграме «Сямейны капітал» 2015—2019 гадоў для шматдзетных сем'яў адкрыта 82 479 дэпазітных рахункаў на $824,8 млн. Памер назначаный у мінулую пяцігодку сумы складаў $10 тысяч для шматдзетных сем'яў, у якіх трэцяе або наступнае дзіця нарадзілася (усыноўлена, удачарона) з 1 студзеня 2015 года да 31 снежня 2019 года ўключна.

Па праграме 2020—2024 гадоў для шматдзетных сем'яў адкрыта 25 896 дэпазітных рахункаў на Br596,6 млн. У новай пяцігодцы сямейны капітал назначаецца шматдзетным сем'ям, у якіх трэцяе або наступнае дзіця нарадзілася (усыноўлена, удачарона) з 1 студзеня 2020 года да 31 снежня 2024 года ўключна. У 2020 годзе памер сямейнага капіталу складаў Br22,5 тысяч, у 2021-м — Br23 737,5, а сума пасля індэксацыі на 2022 год будзе апублікавана ў найбліжэйшы час. У ведамстве нагадалі, што ў адпаведнасці з прэзідэнцкім указам з 1 студзеня гэтага года зменены парадак і пашыраны напрамкі датэрміновага распараджэння сямейным капіталам.

«На 1 студзеня бягучага года на датэрміновае распараджэнне сродкамі сямейнага капіталу пададзена 48 981 заява. У тым ліку на паляпшэнне жыллёвых умоў — 42 622 (87 працэнтаў), на атрыманне адукацыі — 2897 (6 працэнтаў), на атрыманне медыцынскіх паслуг — 3462 (7 працэнтаў). Прынята 46 898 рашэнняў аб датэрміновым распараджэнні сродкамі сямейнага капіталу», — адзначылі ў Мінпрацы.

Больш за ўсё рашэнняў аб размарозцы сямейнага капіталу прынята ў Брэсцкай вобласці — 9973, следам ідуць Мінская — 7921, Гомельская вобласць — 7617, Мінск — 6612, Гродзенская вобласць — 5345, Магілёўская — 4783. Менш за ўсё такіх рашэнняў прынята ў Віцебскай вобласці — 4647.

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

13 СТУДЗЕНЯ 2022 г.
ЧАЦВЕР
№ 1 (15924)

Выдаецца
з 21 красавіка 1921 года

Імёны

## Аляксандр і Святлана ВАРАНІШЧЫ:

# «Сімбіёз шансона і балалайкі»

**Іх дзяцінства прайшло ў шматдзетных сем'ях. Ён нарадзіўся ў Смаргоні, а яна — на Мастоўшчыне. Маім героям пашанцавала, бо кожнага з іх у свой час падтрымалі бацькі, заўважылі іх прагу да музыкі, паспрыялі ў жаданні развівацца ў гэтым кірунку. Менавіта любоў да сцэны аднойчы падарыла маладым людзям сустрэчу, пасля якой яны ўжо ніколі не расставаліся. Аляксандр і Святлана Варанішчы — творчая сямейная пара, якая жыве ў Гродне і выступае з аўтарскімі праграмамі не толькі ў нашай краіне, але і за яе межамі. Як кажа сама Святлана, у іх узаемадапаўняльны дуэт: ён — інструменталіст, знакаміты балалаечнік-віртуоз, а яна — выканальніца народнага шансона.**

Аляксандр упершыню пазнаёміўся з балалайкай у пяць гадоў, калі... малатком разбіў гітару бацькі. Дарэчы, тата суразмоўніка ў маладосці іграў на розных інструментах. Дык вось тады ў краме не аказалася гітары, і Уладзімір Аляксандравіч набыў балалайку. Герой і цяпер памятае тое адчуванне, калі ўзяў у рукі інструмент і пачаў спрабаваць нешта на ім іграць. «Напэўна, — згадвае Аляксандр, — мне тады спадабалася яго гучанне». Пасля маці адвяла яго ў музычную школу. Галіна Браніславаўна хацела, каб сын навучыўся іграць на скрыпцы, як іх суседка. Аднак на пытанне настаўніка, куды хлопчык хоча запісацца, ён рашуча адказаў: «На балалайку». Аляксандр удзячны маці за тое, што яна не стала пярэчыць і дазволіла самому вырашаць свой лёс. «З тых часоў я прапагандую балалайку, хачу даказаць, што не толькі частушкі на ёй іграюць, а можна сыграць усё. Цяпер яна — мой асноўны інструмент, хоць я ўмею іграць практычна на ўсіх», — расказвае музыкант і дадае, што менавіта балалайка — яго прызванне.

Віртуоз выконвае не толькі народныя творы, яму падабаецца класіка, рок, усё — ад эпохі барока і да сучаснасці. Музыкант расказвае, што валодае так званай дробнай тэхнікай на балалайцы. «У мяне «фішка» — нават быў рэкорд падчас навучання ў Лідскім музычным вучылішчы: я выканаў на балалайцы «Палёт чмяля» за 48 секунд, і да гэтай пары, напэўна, ніхто мяне не перайграў». Пасля вучобы будучы артыст адслужыў у арміі. Паступіў у Гродзенскі ўніверсітэт імя Янкі Купалы на факультэт мастацтваў і дызайну, дзе атрымаў спецыяльнасць дырыжора, выканаўца і выкладчыка.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*



Кропка адліку

# ІДЭІ — ПРЫМАЮЦЦА, ІНІЦЫЯТЫВЫ — ВІТАЮЦЦА!

## Усё ў руках актыўных і неабыякавых хлопцаў і дзяўчат




Удзельнікамі праекта «Рэспубліканскі маладзёжны цягнік #БеларусьМоладзьАдзінства» сталі 100 чалавек, якія праехалі па эрыторыі Беларусі каля дзвюх тысяч кіламетраў.

**У маладзёжных грамадскіх аб'яднанняў — мноства амбіцыйных планаў і задач. Адна з самых важных — абмеркаванне праекта змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь: напярэдадні будучага рэферэндуму па ўсёй краіне арганізоўваюцца дыялогавыя пляцоўкі, праводзяцца круглыя сталы, працуюць грамадскія прыёмныя, дзе маладыя людзі могуць атрымаць неабходную інфармацыю і агучыць свае ініцыятывы. Каб абмеркаваць ролю грамадскіх маладзёжных аб'яднанняў у рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі, маладзёжныя лідары сабраліся ў грамадскім прэс-цэнтры Дома прэсы.**

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

Справы кадэцкія

# Прыцягальнасць «Пунсовых пагонаў»

## За імі — строгасць, самадысцыпліна і патрыятызм



**Пачаць лаканічна, па-спартанску, не атрымаецца — ужо вельмі зачапіла мяне гэтая ваенная тэма. Наша прэс-каманда выправілася ў Гомель. Мы прыехалі ў кадэцкае вучылішча, каб пагутарыць з навучэнцамі, даведацца больш пра ўмовы іх жыцця і вучобы. Дарэчы, апынуліся мы там дзякуючы цёпламу запрашэнню ад Варатынскай школы Калінкавіцкага раёна. Яе вучні наладзілі кантакт з кадэтамі адносна нядаўна, калі ў вёсцы Савічы прайшло пахаванне байцоў, знойдзеных пошукавым клубам «Пунсовыя пагоны» (пра яго мы раскажам крыху пазней).**

...У школьным музейным пакоі нас сустрэў і рады быў бачыць **настаўнік гісторыі Павел Уладзіміравіч ДЗЯНІСЕНКА.** Як аказалася, ён практычна наш зямляк.

— Я родам з Калінкавіч, таму, калі даведаўся пра ваш прыезд, стала вельмі прыемна. На жаль, сам дома бываю рэдка. Вы знаходзіцеся ў кадэцкім вучылішчы. Установа вельмі цікавая, у вобласці падобных больш няма. Усяго такіх у краіне восем, знешне яны вельмі падобныя адна да адной. Але Гомельскае кадэцкае вучылішча самае маладое, мы «з'явіліся на свет» толькі ў 2013 годзе, — расказаў наш суразмоўнік.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)*

# ІДЭІ — ПРЫМАЮЦЦА, ІНІЦЫЯТЫВЫ — ВІТАЮЦЦА!

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Па словах **старшыні Рэспубліканскага саюза грамадскіх аб'яднанняў «Беларускі камітэт маладзёжных арганізацый» (БКМА) Паўла АЛЕКСЫ,** асноўныя кірункі работы камітэта — стварэнне ўмоў для найбольш поўнай рэалізацыі правоў і законных інтарэсаў моладзі, арганізацыя інфармацыйнай прасторы, падтрымка маладзёжных праектаў і ініцыятыў.

Дарэчы, цяпер гранты Прэзідэнта будуць прадастаўляць і ў сферы маладзёжнай палітыкі. Адпаведны ўказ падпісаў напрыканцы года кіраўнік нашай дзяржавы. На іх змогуць прэтэндаваць аўтары найлепшых сацыяльна значных праектаў. Так што ўсё ў руках актыўнай і неабыякавай моладзі...

Павел Алекса расказаў, што на сёння існуе мноства маладзёжных арганізацый. Даведацца аб іх рабоце можна на партале **«моладежь.бел»**. Увогуле, гэты партал змяшчае шмат карыснай інфармацыі для навучэнскай і студэнцкай моладзі, для маладых спецыялістаў, маладых сем'яў і прызыўнікоў: пра размеркаванне, гарантыі і кампенсацыі маладым спецыялістам, дзяржаўную адрасную дапамогу маладым сем'ям, забеспячэнне жыллём, прызыў у войска і ўмовы атрымання адтэрміноўкі...

Рэспубліканскі саюз грамадскіх аб'яднанняў «Беларускі камітэт маладзёжных арганізацый» уяўляе сабой парасонавую структуру, своеасаблівы каардынацыйны цэнтр, які аб'ядноўвае розныя дзіцячыя і маладзёжныя грамадскія арганізацыі нашай краіны. У склад камітэта ўваходзяць арганізацыі, якія займаюцца патрыятычным, валанцёрскім, інтэлектуальным, творчым і спартыўным выхаваннем дзяцей і моладзі — усяго 25 аб'яднанняў.

Вядома, пандэмія ўнесла пэўныя карэкціроўкі ў дзейнасць БКМА, але праца ўсё роўна не спынялася.

— Было нямала зроблена і ў сферы міжнароднага супрацоўніцтва. Нам нават удавалася супрацоўніцтва асабіста, напрыклад, з калегамі з Расіі і Узбекістана. А калі няма магчымасці для асабістай сустрэчы, вядома, выкарыстоўваем электронную сувязь, — расказаў Павел Алекса.

По яго словах, у гэтым годзе будзе працягнута практыка правядзення сацыялагічных даследаванняў. Традыцыйным стала рэспубліканскае сацыялагічнае даследаванне «Маладзёжны брэнд». У 2021 годзе яно праводзілася ўжо пяты раз, але ў анлайн-фармаце — упершыню. Гэта было прадыктавана дзвюма прычынамі: складанай эпідэміялагічнай абстаноўкай, выкліканай пандэміяй каранавіруса, і спецыфікай маладзёжнай аўдыторыі (цяпер ва ўсіх ёсць сучасныя гаджэты і тэхналагічныя сродкі сувязі). Анлайнфармат аказаўся больш просты, хуткі і эфектыўны. Сёлета БКМА збіраецца пашырыць кола пытанняў для даследавання і пацікавіцца ў маладых людзей іх ладам жыцця, формамі адпачынку, інтарэсамі ў інтэрнэце. Пералік пытанняў яшчэ фарміруецца...

**Мікіта КОЛЕСАЎ — студэнт БДПУ — у пачатку снежня ўзначаліў Грамадскі рэспубліканскі студэнцкі савет пры Міністэрстве адукацыі.**

— Наша арганізацыя стварае канал прамой сувязі паміж студэнтамі і міністэрствам, — тлумачыць Мікіта. — Савет з'яўляецца калегіяльным дарадчым выбарным органам студэнцкага самакіравання ўстаноў вышэйшай адукацыі. Кожная ВНУ прадстаўлена ў ім адным голасам (незалежна ад колькасці студэнтаў, што ў ёй навучаюцца).

Асноўная задача Грамадскага студэнцкага савета — даносіць думкі студэнцкай моладзі да кіраўнікоў сістэмы адукацыі, задаваць ім «нязручныя пытанні», дапамагаць спецыялістам у пошуку канструктыўных рашэнняў праблем. Паколькі амаль усе студэнты бавяць час у сацыяльных сетках і месенджарах, Грамадскі студэнцкі савет займаецца папулярызацыяй сваёй дзейнасці ў «Інстаграме» і «Тэлеграме», а ў найбліжэйшы час запусцяць акаўнт і ў TikTok, таму што ўся моладзь перамясцілася менавіта ў гэту сацыяльную сетку.

У найбліжэйшых планах — умацаваць сувязі са Студэнцкім саветам расійскіх ВНУ — для абмену меркаваннямі і вопытам.

Пытанні міжнароднага супрацоўніцтва закрануў і **старшыня маладзёжнага дабрачыннага грамадскага аб'яднання «Горад без наркотыкаў» Пётр ШАПКО.** Гэта аб'яднанне пры падтрымцы Міністэрства адукацыі прасоўвае буйны міжнародны грамадска-выхаваўчы праект «Кінаўрокі ў школах свету». У рамках праекта ствараюцца кінаўрокі — дзіцячыя кароткаметражныя фільмы аб справядлівасці, шчырасці, пачуцці абавязку і іншых духоўна-маральных паняццях. Яны суправаджаюцца метадычнымі дапаможнікамі для правядзення педагогамі пазакласных заняткаў. Маладзёжнае аб'яднанне «Горад без наркотыкаў» садзейнічае адкрыццю ваенна-патрыятычных клубаў, прапагандуе здаровы лад жыцця, праводзіць тлумачальныя гутаркі, арганізоўвае форумы, прасоўвае заканадаўчыя ініцыятывы, звязаныя з барацьбой супраць шкодных звычак і правапарушэнняў.



**У Год народнага адзінства БРСМ рэалізаваў рэспубліканскі праект «Ведаю Беларусь» па хуткаснай зборцы спілс-карт.**

— У нас дзейнічае сетка клубаў ваенна-патрыятычнага выхавання, дзе заняткі для падлеткаў праходзяць на бясплатнай аснове, — праінфармаваў Пётр Шапко. — Яны адкрываюцца на базе часцей унутраных войскаў. У Мінску ўжо створаны тры такія клубы. Гэта вельмі добрая і карысная ініцыятыва, у якой, як мы лічым, перспектыўная будучыня.

На жаль, у справе прафілактыкі сацыяльна небяспечных з'яў, такіх як наркаманія, алкагалізм і іншыя, існуюць розныя пункты гледжання.

— На нашу думку, праблема заключаецца ў тым, што нярэдка «прафілактыка» ператвараецца ў рэкламу ці нават прапаганду таго, з чым яна павінна змагацца. Як кажа народная мудрасць, добрымі намерамі выслана дарога ў пекла. У выніку часта можна назіраць сітуацыі, калі з ростам колькасці прафілактычных мерапрыемстваў масава павялічваюцца і тыя з'явы, на процідзеянне якім гэтыя мерапрыемствы былі накіраваны. Таму мы лічым, што дзяржаве неабходна вызначыцца з адзіным падыходам да прафілактыкі. Трэба наладзіць масавае навучанне асоб, якія праводзяць прафілактычную работу з ліку педагогаў, і распрацаваць рэкамендацыі для навучальных установ аб прынцыпах правядзення такой работы. Увогуле, неабходны адзіны комплексны падыход да вырашэння праблем выхавання, — падкрэсльвае Пётр Шапко.

**Рэспубліканскае творчае маладзёжнае грамадскае аб'яднанне «Прасоўванне моладзі»** зусім маладое. Тым не менш за 11 месяцаў яго існавання было праведзена ўжо 86 мерапрыемстваў, у тым ліку патрыятычнай, сацыяльнай і гуманітарнай накіраванасці.

— Зараз наша арганізацыя налічвае 105 членаў. Да нас пастаянна далучаюцца актыўныя хлопцы і дзяўчаты, што не можа не радаваць, таму што капіталам любога грамадства з'яўляецца чалавечая ініцыятыва, — канстатуе **старшыня аб'яднання Андрэй МЯХЕДКА.** — А мы падтрымліваем маладыя таленты, імкненне маладых людзей да самаразвіцця і ствараем для гэтага адпаведныя ўмовы. Менавіта з такіх аб'яднанняў па інтарэсах і вырастаюць з цягам часу буйныя грамадскія арганізацыі. Вялікай цікавасцю, напрыклад, карысталіся нашы майстар-класы па жывапісе, заняткі радыёэлектронікай, спартыўнай пеленгацыяй і англійскай мовай.

Мы адштурхоўваемся ад патрэб і запытаў маладых людзей: бачым зараз іх жаданне асвойваць вакал і музычныя інструменты. Таму ў нашых найбліжэйшых планах — адкрыць яшчэ два-тры адукацыйныя офісы ў Мінску, а затым маштабаваць гэты вопыт на абласныя цэнтры. Таксама праводзім культурныя мерапрыемствы з мэтай захавання і развіцця беларускай культуры. Гэта адзін з нашых найважнейшых напрамкаў дзейнасці.

Каб стаць членам Рэспубліканскага творчага маладзёжнага грамадскага аб'яднання «Прасоўванне моладзі», трэба запоўніць заяўку і адправіць яе на электронную пошту **info@ruhnaperad.by**. Па тым жа адрасе можна пакінуць заяўку, калі з'явілася цікавая ідэя для мерапрыемства і жаданне пасупрацоўнічаць з маладым маладзёжным грамадскім аб'яднаннем.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*Важная справа*

# «Салдацкі канверт», «Фермер-пачатковец»...

## ...якія яшчэ праекты могуць аб'яднаць моладзь Саюзнай дзяржавы?

**«Мы хацелі б, каб работа з моладдзю была рэальнай, поўнай, цікавай і нефармалізаванай. Не работай, якая працісквaецца зверху, а работай тых, хто адчувае, гарыць інтарэсамі і лёсам сваёй краіны», — такую думку выказаў Дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Расіі і Беларусі Дзмітрый МЕЗЕНЦАЎ, які ў апошнія дні снежня сустрэўся са старшынёй Расійскага саюза моладзі, членам Грамадскай палаты РФ Паўлам КРАСНАРУЦКІМ і выканаўчым дырэктарам Міжнароднага саюза грамадскіх аб'яднанняў «Расійска-Беларускі саюз моладзі», членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу РБ Дзмітрыем ВАРАНЮКОМ.**

Расійска-Беларускі саюз моладзі — арганізацыя, якая добра дэманструе прынцыпы функцыянавання Саюзнай дзяржавы. Пры захаванні аўтаномнасці двух найбуйнейшых маладзёжных аб'яднанняў — Расійскага саюза моладзі і Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі — выкарыстоўваюцца рэсурсы абодвух бакоў для стварэння ўмоў для развіцця і самарэалізацыі моладзі Саюзнай дзяржавы. Пад патранажам саюза рэалізаваны такія міжнародныя маладзёжныя праекты, як «Руская Зіма», «Моладзь за Саюзную дзяржаву», міжнародны лагер «Бе-La-Русь», у якім прымаюць удзел дэлегацыі з трох краін — Беларусі, Расіі і Латвіі, міжвузаўскі конкурс грацыі і артыстычнага майстэрства «Каралева вясна» (цяпер «Каралева студэнцтва»), і многія іншыя.

Адзін з ключавых напрамкаў дзейнасці саюза — грамадзянска-патрыятычнае выхаванне моладзі і захаванне гістарычнай памяці. Так, у ліпені мінулага года прайшоў Міжнародны патрыятычны форум «Мы памятаем!». У Пскове сабралася больш як 100 удзельнікаў з Расіі і Беларусі, каб прадставіць найлепшыя практыкі патрыятычнага выхавання.

Маладзёжнай палатай пры Парламенцкім сходзе Беларусі і Расі быў ініцыяваны міжнародны праект «Лічбавая зорка», які актыўна падтрымалі грамадскія аб'яднанні і мясцовыя ўлады дзвюх краін. Яго ідэя заключаецца ў стварэнні карты памятных мясцін, звязаных з Вялікай Айчыннай вайной, і алічбаваннем звестак пра помнікі і воінскія мемарыялы на тэрыторыі Саюзнай дзяржавы. Сумесна з маладымі гісторыкамі, валанцёрамі, клубамі рэканструктараў вядзецца пошук інфармацыі пра падзеі, жыццё і подзвігі герояў, памяць пра якіх увасоблена ў камені.

У маі гэтага года пройдзе міжнародны этап конкурсу «Салдацкі канверт». Усерасійскі патрыятычны фестываль-конкурс «Салдацкі канверт» — цэнтральнае мерапрыемства для вакалістаў, якія выконваюць песні на ваенна-патрыятычную і грамадзянскую тэматыку. Ён аб'ядноўвае найлепшых выканаўцаў ва ўзросце ад 14 да 35 гадоў. Фінал конкурсу ў Стаўрапалі ўключае конкурсныя дні, наведванне музеяў, экскурсій, майстар-класаў членаў журы, цырымоніі адкрыцця і закрыцця, а таксама мноства канцэртаў. Плануецца, што цяпер да конкурсу далучацца і таленавітыя беларусы. У Стаўрапаль з нашай краіны адправіцца вялікая творчая дэлегацыя.

А 24 студзеня ў Стаўрапалі пройдзе фінал міжнароднага конкурсу грацыі, таленту і артыстычнага майстэрства «Каралева студэнцтва», дзе сем дзяўчат будуць прадстаўляць Беларусь і восем — Расію. Зараз актыўна працуе рэжысёрска-пастановачная група. Прыгажуні рыхтуюцца годна прадставіць сваю краіну на міжнароднай арэне. Да таго ж сёлета ў конкурсу юбілей: ён пройдзе ўжо ў трыццаты раз.

У найбліжэйшых планах Расійска-Беларускага саюза моладзі значацца развіццё маладзёжнага прадпрымальніцтва і патрыятычнага турызму на прасторы Саюзнай дзяржавы, патрыятычная акцыя «Мы — грамадзяне Саюзнай дзяржавы». Летась прайшла міжнародная інтэлектуальная бізнес-гульня «Фермер-пачатковец». У Беларусі яе арганізатарам выступіў БРСМ пры падтрымцы Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання. Арганізатар міжнароднага фіналу гульні — Расійскі саюз сельскай моладзі. Асноўная мэта праекта — развіццё навыкаў бізнес-планавання ў сельскай гаспадарцы і выпрацоўкі камандных рашэнняў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*Погляд праз час*

# Віртуальнае сэрца шчыра шчыміць

**«Мы захоўваем памяць... Каб зразумець сэрцам! Дзеля Міру! У імя Чалавечасці!» — такую, ні больш, ні менш, грамадзянскую місію абрала для сябе каманда маладых гісторыкаў з Гомельшчыны. Яны «ажыўляюць» герояў без зброі — мірных людзей, што перанеслі нягоды Вялікай Айчыннай вайны. У Год гістарычнай памяці падобныя ініцыятывы, якія ў прывабным для моладзі фармаце дапамагаюць фарміраваць аб'ектыўныя адносіны да гістарычнага мінулага, — матывуюць далучацца да даследчыцкай дзейнасці, спрабаваць ствараць свае цікавыя патрыятычныя праекты.**

Два гады таму маладая мама ў дэкрэце — **намеснік старшыні Камісіі па справах непаўналетніх Гомельскага райвыканкама, дэпутат Гомельскага раённага Савета дэпутатаў, юрыст, гісторык — Кацярына ВОЛЧАК** захапілася ідэяй анлайн-рэсурсу па ўвекавечанні памяці мірных жыхароў Гомельскай вобласці, якія пацярпелі ў гады вайны. За справу Кацярына ўзялася разам з гомельскім **гісторыкам Уладзімірам АЛЕКСАНДРОНЦАМ**. У актыўных маладых людзей ужо быў вопыт сумеснай работы — патрыятычны праект у сетцы «Інстаграм» «Беларускі сямейны альбом», створаны на аснове фатаграфій нулявых — 60-х гадоў XX стагоддзя.

— Падалося, што такая работа можа хутка пачаць успрымацца толькі як звычайны архіў старых фатаграфій, — расказвае малады дэпутат Кацярына Волчак. — Пры гэтым нам як гісторыкам не давала спакою ўсведамленне, што ўвогуле праблема грамадзянскага насельніцтва ў ваеннай гістарыяграфіі — гэта не проста праблема погляду, але адсутнасці інфармацыі, «неперажытасці» лёсаў странчанага пакалення.

Аўтары імкнуліся стварыць даступны, цікавы, а галоўнае — дакументальна пацверджаны інфармацыйны прадукт, які дапаможа сфарміраваць культуру памяці, здольнасць да асэнсавання, вывучэння і ўсведамлення праз чалавечыя лёсы падзей ваеннага часу.

— Цяпер стагоддзе візуалізацыі і інтэрнэту. Анлайн-рэсурсы дапамагаюць захаваць важную інфармацыю і азнаёміць з ёй шырокае кола карыстальнікаў. Існуе нямала платформаў, прысвечаных тым, хто ваяваў у гады вайны: «Памяць народа», «Партызаны Беларусі», АБД «Мемарыял» і іншыя праекты, якія дазваляюць устанавіць лёс і шлях герояў вайны. Але вось звестак аб жыцці мірнага насельніцтва ў час акупацыі, эвакуіраваных земляках, жыхарах спаленых вёсак у інтэрнэце пакуль недастаткова, — звяртае ўвагу Кацярына Волчак.

DOC-цэнтр «Тапаграфія памяці» — анлайн-платформа, дзе сабраныя матэрыялы аб лёсах мірных жыхароў 17 раённых цэнтраў былой Палескай вобласці. У аснове платформы — матэрыялы занальнага архіва ў Мазыры, але большасць даных — гэта так званая вусная гісторыя, успаміны і сведчанні відавочцаў. Частка матэрыялаў — алічбаваныя матэрыялы Беларускага дзяржаўнага архіва кінафотафонадакументаў у Дзяржынску, многія з якіх нідзе і ніколі не публікаваліся.

— Падчас работы ў Мазыры мы знайшлі масіў інфармацыі, у тым ліку акты расследаванняў злачынстваў нацыстаў і спісы жыхароў па ўсіх вёсках і раёнах былой Палескай вобласці. Мы вырашылі, што проста абавязаныя заняцца гэтай справай, дзеля гістарычнай справядлівасці, каб адняваць памяць аб пацярпелым грамадзянскім насельніцтве. Бо за вельмі скупымі звесткамі «загінуў кожны трэці» крыюцца рэальныя чалавечыя лёсы, — дзеліцца Кацярына.

Для даследавання былая Палеская вобласць абрана невыпадкова. Як нагадваюць гісторыкі, тут дастаткова доўга знаходзілася самая буйная і добра падрыхтаваная нямецкая група армій «Цэнтр», пры гэтым у рэгіёне разгарнуўся вялізны партызанскі рух. Менавіта на Палессі некаторыя вёскі былі спаленыя па тры-чатыры разы — разам з людзьмі і культурнай спадчынай. Многія ратаваліся разам з партызанамі ў лясах і балотах.

Дарэчы, патрыятычны праект гісторыкаў захапіў цікавасцю да даследчыцкай дзейнасці і школьнікаў, маладых педагогаў Гомельшчыны. Дзякуючы падтрымцы Галоўнага ўпраўлення адукацыі Гомельскага аблвыканкама ў раёнах вобласці правялі завочныя пошукавыя экспедыцыі. Частка матэрыялаў, сабраных школьнікамі і настаўнікамі, звесткі, перададзеныя з краязнаўчых музеяў, таксама ляглі ў аснову платформы.

«Тапаграфія памяці» складаецца з некалькіх кампанентаў. Сярод іх — месцы памяці. Раздзел «База памяці» сфарміраваны са спісаў мірных людзей, знішчаных на тэрыторыі рэгіёна, і людзей, якіх вывезлі на прымусовыя работы.

— Праз лёс чалавека, асобнай сям'і мы імкнёмся паказаць агульначалавечую трагедыю, — кажа Кацярына. — Кожная расказаная гісторыя — бясконца кранальная і трагічная. Напрыклад, у невялікім населеным пункце Млынок цяперашняга Петрыкаўскага раёна (былы Капаткевіцкі) стаіць да гэтага часу склеп, у якім падчас вайны знайшлі прыстанішча дванаццаць дзяцей і тры жанчыны. Вёска вымірае, і аб гэтым месцы жыцця і смерці ведаюць толькі старажылы.

Кранае гісторыя, якую перажыла Вольга Антанішына з Капаткевіч. Перад вайной яе бацьку, былога старшыню калгаса, рэпрэсіравалі і расстралялі. У 1943-м немцы спалілі родны пасёлак, а дзяўчынка разам з роднымі пайшла жыць у лес. Падчас адной з аблаў Вольгу злавілі і разам з землякамі адправілі на прымусовыя работы ва Усходнюю Прусію.

— Мяне ўразіла гісторыя Надзеі Ганущ, жыхаркі вёскі Верхнія Жары Камарынскага раёна, якую адправілі на работы ў Нямеччыну ў дзіцячым узросце, — дзеліцца дэпутат. — Гераіня расказвала, як нямецкая сям'я, у якую яна трапіла, ставілася да яе па-чалавечы, бачыла ў ёй дзіця. Пасля вызвалення ў 1945 годзе Надзея доўгія дзесяцігоддзі ўспаміналa пра іх з любоўю і падзякай. Гэта адзін з прыкладаў, калі чалавек застаецца чалавекам і на вайне. Увогуле, лічу, тэма «остарбайтараў» застаецца недастаткова вывучанай у ваеннай гісторыі нашага народа.

Праект — DOC-цэнтр «Тапаграфія памяці», упэўненыя стваральнікі, будзе цікавы сваім сучасным фарматам і падыходам у падачы матэрыялаў для работы педагогаў, правядзення выхаваўчых мерапрыемстваў. Настаўнікі могуць не толькі карыстацца змешчаным там матэрыялам, але і дзяліцца ўласнымі напрацоўкамі. Дарэчы, для тых, хто жадае далучыцца да даследчай работы, дадзены адпаведныя рэкамендацыі. Спецыяльнае месца на платформе адведзена для падраздзела «Даследчыку». Энтузіясты і гісторыкі, у тым ліку выкладчыкі з Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны, ужо пачалі публікаваць там свае работы.

— Перад кожнай публікацыяй мы старанна вывучаем усе матэрыялы, а разам з імі пранікаемся гісторыяй чалавека, натхняемся лёсам таго самага героя без зброі — мірнага жыхара, які на сваёй малой радзіме ці на чужыне твар у твар сутыкнуўся з вайной, — кажа Кацярына. — Акрамя таго, мы звяртаем увагу таксама на даваенны перыяд. Такім чынам хочам перадаць шырокую карціну жыцця людзей, не зацыкліваюцца на архівах, гісторыі перыяду акупацыі і перыяду вайны.

Сёння любы жадаючы, у каго ёсць архіўныя матэрыялы, успаміны, можа іх размясціць на платформе. Пры гэтым на рэсурсе не вітаюцца ацэначныя меркаванні і каментарыі. Чытач павінен зрабіць высновы сам, паразважаць, перажыць гэтыя гісторыі. Строга на платформе захоўваецца і аўтарскае права, не дапускаецца капіраванне матэрыялаў архіўнага характару.

— Хацелася б запрасіць да супрацоўніцтва і музейныя ўстановы, — заклікае малады дэпутат. — Пытанне лічбавага размяшчэння сёння асабліва актуальнае. Калі чалавек убачыць матэрыялы ў такім выглядзе, потым ён захоча азнаёміцца з імі ўжывую і наведае музей. Запрашаем дапамагчы нам у алічбоўцы фатаграфій, успамінаў, пошуку месцаў масавага знішчэння. Усе, хто выкажа жаданне супрацоўнічаць, будуць уключаны ў спіс сяброў платформы, і разам мы маглі б зрабіць лічбавую базу для Гомельскай вобласці. Таксама запрашаем да супрацоўніцтва ўстановы адукацыі.

Разам з тым, як звяртае ўвагу гісторык, анлайн-прастору лічбавага DOC-цэнтра можна пашыраць іншымі тэрыторыямі даследавання, нарошчваць патэнцыял.

— Гэта важна, бо непасрэдныя ўдзельнікі ваенных дзеянняў з кожным днём ад нас сыходзяць, і нельга марнаваць час, пакуль яшчэ жывыя дзеці, якія знаходзіліся на акупаванай тэрыторыі, вязні канцлагераў, людзі, якіх зганялі на работу, — рэзюмуе Кацярына. — Дадзеная анлайн-прастора для сучаснага маладога і будучых пакаленняў — напамін пра тое, што вайна — страшная трагедыя, паўтарэння якой нельга дапусціць.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Фота з архіва гераіні.**



**Кацярына Волчак і Уладзімір Александронец падчас работы над гістарычнай анлайн-платформай.**

*Дапытлівы розум*

# У БАНКУ НАВУКОВЫХ ТАЛЕНТАЎ — ПАПАЎНЕННЕ

## Дзесяць маладых вучоных сталі лаўрэатамі конкурсу «100 маладых талентаў НАН Беларусі»

Банк маладых талентаў папоўнілі Таццяна ДОЎГАЧ, старшы навуковы супрацоўнік аддзела спецыяльных гістарычных даследаванняў Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, кандыдат гістарычных навук; Эдуард ДЫБА, загадчык лабараторыі механізацыі нарыхтоўкі кармоў рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Навукова-практычны цэнтр Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па механізацыі сельскай гаспадаркі», кандыдат тэхнічных навук, дацэнт; Таццяна ЗУБАР, старшы навуковы супрацоўнік лабараторыі фізікі магнітных плёнак Навукова-практычнага цэнтра НАН па матэрыялазнаўстве, кандыдат фізіка-матэматычных навук; Аляксандра КАЗАК, старшы навуковы супрацоўнік цэнтра «Фізіка плазмы» Інстытута фізікі НАН, кандыдат фізіка-матэматычных навук; Аляксандр РАГАЧОЎ, дырэктар Інстытута хіміі новых матэрыялаў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар тэхнічных навук, прафесар; Ганна РУДАК, вядучы навуковы супрацоўнік лабараторыі конегадоўлі, звераагадоўлі і дробнай жывёлагадоўлі Навукова-практычнага цэнтра Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па жывёлагадоўлі, кандыдат сельскагаспадарчых навук, дацэнт; Аліна САЎЧУК, вядучы навуковы супрацоўнік лабараторыі хіміі стэроідаў Інстытута біяарганічнай хіміі НАН, кандыдат хімічных навук; Алена СТАНЧЫК, старшы навуковы супрацоўнік лабараторыі фізікі паўправаднікоў Навукова-практычнага цэнтра НАН па матэрыялазнаўстве, кандыдат фізіка-матэматычных навук; Кірыл СЫЦЬКО, старшы навуковы супрацоўнік сектара «Цэнтр энцыклапедычных выданняў» Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, кандыдат гістарычных навук, і Ганна ШЧАЮК, вучоны сакратар Інстытута генетыкі і цыталогіі НАН, кандыдат навук.

Штогадовы конкурс «100 маладых талентаў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» быў заснаваны ў 2018 годзе. Агульная колькасць маладых вучоных, якія адначасова ўваходзяць у банк даных «100 маладых талентаў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», не можа перавышаць 100 чалавек, а штогадовая колькасць лаўрэатаў конкурсу — не большая за 20 чалавек.

Да ўдзелу ў конкурсе дапускаюцца кандыдаты навук ва ўзросце да 30 гадоў і дактары навук ва ўзросце да 40 гадоў, якія працуюць у арганізацыях НАН Беларусі. Лаўрэаты конкурсу ўключаюцца ў банк даных «100 маладых талентаў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» (з выдачай адпаведнага сертыфіката) і ў рэзерв кіруючых кадраў НАН Беларусі, атрымліваюць штогадовы грант на ўдзел у міжнародным навуковым, навукова-арганізацыйным або навукова-практычным мерапрыемстве (гэта можа быць канферэнцыя, сімпозіум, навуковая школа, кароткатэрміновая стажыроўка і г. д.) і штогадовую прэмію ў памеры да 7 базавых ставак у перыяд уваходжання ў банк даных.

Кандыдаты навук могуць знаходзіцца ў банку да дасягнення імі 35-гадовага ўзросту, а дактары навук — да 45 гадоў.

Мэта конкурсу «100 маладых талентаў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» — амаладжэнне кадравага саставу навуковых арганізацый і забеспячэнне пераемнасці паміж вучонымі розных пакаленняў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**



Дырэктар ААТ «Мурава» Пётр БІЛЕЦКІ.

# ЗАЛАТЫ ЗАПАС

## Сельгаспрадпрыемства, якое пастаянна шануе гісторыю гаспадаркі, клапоціцца

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.





Кнігі з гісторыяй прадпрыемства «Мурава». Раней яно называлася «Калгас ім. Калініна».

**З адкрытым акцыянерным таварыствам «Мурава» Пружанскага раёна «Звязда» сябруе даўно. Мы неаднойчы расказвалі на старонках газеты, як гэтая невялікая па сённяшніх мерках гаспадарка трывала стаіць на нагах, жыве па сродках і разам з тым устойліва развіваецца. Тут у любой сітуацыі ўмеюць знаходзіць баланс, дбаючы пра якасць работы, яе прыбытковасць.**

### Кніга пашаны і славы

Разважаючы пра змены, якія адбываліся на працягу чатырох дзесяцігоддзяў яго працоўнай дзейнасці, **дырэктар «Муравы» Пётр БІЛЕЦКІ** сказаў так:

— З той пары вытворчасць змянілася кардынальна. На службу чалавеку прыйшлі новая тэхніка і тэхналогіі. Асобныя нашы ветэраны яшчэ памятаюць, як убіралі і апрацоўвалі лён, для цяперашніх маладых тая праца падалася б ледзь не катаржнай, ды і нарыхтоўка кармоў была не нашмат лягчэйшай. Менш за паўстагоддзя таму вытворчы працэс патрабаваў шмат чалавечай сілы, а цяпер усё робяць машыны і трактары. На ферме работа стала зусім іншай, вытворчыя працэсы амаль цалкам механізаваны. На машынным двары стаіць высокапрадукцыйная тэхніка, у асноўным камп'ютарызаваная. Але нязменным застаецца адно — сумленнасць працаўніка, шчырасць у адносінах да зямлі. Апошняе — у традыцыі гаспадаркі. Мы заўсёды памятаем, што сённяшняя трывалая эканамічная база акцыянернага таварыства — у многім заслуга ветэранаў вытворчасці, таго пакалення, якое сёння на заслужаным адпачынку.

Менавіта ім, ветэранам, вырашана прысвяціць гэты выпуск. З **намеснікам дырэктара «Муравы» Аляксандрам МАРКЕЧКАМ** разглядаем кнігу народнай славы і пашаны. Гэты асаблівы фаліянт у цвёрдым пераплёце зроблены з аддрукаваных на машынцы аркушаў. Кнігу пачалі складаць некалькі дзясяткаў гадоў таму. Тут занатавана гісторыя не толькі калгаса, але і вёсак, што ўваходзяць у тэрыторыю гаспадаркі. А галоўнае, сюды занесены дасягненні як усяго сельгаспрадпрыемства, так і асобных яго работнікаў. Трапіць на старонкі кнігі пашаны было вялікім гонарам, прозвішча сюды заносілі рашэннем праўлення калгаса. Звычайна такое рашэнне суправаджалася грашовым заахвочваннем.

### Гісторыя калгаса і вёсак

Гартаем кнігу і чытаем, што калгас імя Калініна Сухопальскага сельсавета пачынаўся з калгаса «Чырвоная Мурава», які быў утвораны ў красавіку 1941 года. У калгас тады ўступіла 36 аднаасобных гаспадарак. Першым старшынёй стаў **Аляксандр Радзівончык**. У 1948 годзе калгас быў адноўлены. З часам калектыўная гаспадарка перажыла ўзбуйненне. Далучыліся калгасы суседніх вёсак, яна атрымала імя Молатава. А ў 1957 годзе калгасу прысвоілі імя Калініна. Дваццаць гадоў таму гаспадарка атрымала цяперашнюю назву.

Шмат старонак у гэтай кнізе прысвечана ваеннаму перыяду вёскі Мурава. На трэці дзень вайны акупанты расстралялі 11 мірных жыхароў вёскі ў адказ на абстрэл нямецкага абозу, да якога тыя калгаснікі не мелі дачынення. Шмат сваіх жыхароў страцілі Мурава і навакольныя вёскі за гады ваеннага ліхалецця. Намаганнямі гаспадаркі ў іх гонар пастаўлены помнік у цэнтры вёскі, а імёны ўвекавечаны ў тым ліку і ў гэтай кнізе. Сельгаспрадпрыемства даглядае і брацкую магілу тых загінулых 11 вяскоўцаў.

У кнізе год за годам, пяцігодка за пяцігодкай апісаны дасягненні па ўраджайнасці збожжавых, надоях малака на кожнай ферме, прывагах жывёлы, фінансавых выніках гаспадарання, а таксама поспехі асобных працаўнікоў. Многія ў тыя гады атрымлівалі высокія ўрадавыя ўзнагароды. Імі, ардэнаносцамі, і цяпер ганарыцца «Мурава», такімі як:

**Міхаіл Аляксандравіч Шука,**
**Надзея Рыгораўна Дулько,**
**Міхаіл Паўлавіч Пстыга.**

Уручэнне ордэна альбо медаля заўсёды станавілася падзеяй для калгаса. Пра падзеі засталіся не толькі запісы ў кнізе. Недзе на рубяжы 1970—1980 гадоў кіраўніцтва тагачаснага калгаса імя Калініна запрасіла маскоўскіх мастакоў на адмысловы пленэр у гаспадарку. Яны напісалі карціны з калгаснага жыцця, у якіх увасобілі сваё бачанне вясковай рэчаіснасці. І гаспадарка выкупіла работы вельмі нятанна па тых часах. Цяпер большасць з іх знаходзіцца ў падсобным памяшканні майстэрні. Самае каштоўнае, што на палотнах адлюстраваны тутэйшыя людзі, на іх пазнаюць былых паляводаў і трактарыстаў, былых кіраўнікоў калгаса і раёна. Некалі яны зоймуць сваё месца ў музеі, які пакуль што ў планах. Там жа будзе захоўвацца і кніга пашаны.

А пакуль што на бачным месцы ў Мураве ўсталявалі мемарыяльную шыльду, дзе адзначаны ўсе вехі слаўнай гісторыі гаспадаркі.

Пашана да гісторыі тут шчыльна звязана з пашанай да ветэранаў працы. На справаздачна-выбарныя сходы, на святы іх заўсёды запрашаюць разам з дзеючымі працаўнікамі, ушаноўваюць падарункамі, грашовымі прэміямі. Пра гэта нам з удзячнасцю расказвалі самі ветэраны калгаснай вытворчасці.



Намеснік дырэктара «Муравы» Аляксандр МАРКЕЧКА.

### Ударнік жывёлагадоўлі

**Надзея Андрэеўна АБАКУМАВА** вельмі ганарыцца знакам «Ударнік камуністычнай працы», які яна атрымала ў 1970-х гадах. Родам яна з іншай вёскі, у Мураву пераехала да мужа. Спачатку выхоўвала маленькіх дзяцей, займалася ўласнай гаспадаркай. На работу выйшла ў 1970 годзе, калі меншаму споўнілася тры гады. І першым яе рабочым месцам была свінаферма.

— Сказаць, што работа была цяжкая, амаль нічога не сказаць, — згадвае жанчына. — Спачатку ніякай механізацыі, з інструментаў толькі рукі, вілы, мяцёлкі ды непад'ёмныя вёдры. Мы, тры жанчыны, даглядалі амаль 900 галоў свіней. Рабочыя з брыгады вязалі з бярэзніку венікі, якіх хапала ненадоўга. Некалькі разоў на дзень даводзілася вымесці з-пад жывёлін гной і выкінуць з хлява. Праз нейкі, можа, год з'явіўся транспарцёр, і стала лягчэй, даводзілася выграбаць са стойлаў у канаўку, адкуль змесціва механічным спосабам выдалялася. Акрамя таго, накарміць пагалоўе азначала ўручную нацягаць корм вёдрамі і раздаць. Але ж мы маладымі былі, не адчувалі цяжкасці, вечарам яшчэ і ў клуб на рэпетыцыі бегалі. Весела жылі — згадвае жанчына.

Там Надзея Андрэеўна адпрацавала шэсць гадоў, потым перайшла ў кароўнік, дзе ёй дaручылі самы адказны ўчастак — работу з першацёлкамі, маладымі каровамі, якія яшчэ не прывучаны да механічнай дойкі. Любы жывёлавод ведае, што нават цяпер з першацёлкамі самая складаная работа на ферме.



Надзея АБАКУМАВА працавала даяркай.

— Мне часам здавалася, што гэтыя маладыя наравістыя каровы б'юцца мацней, чым коні. З імі варта ўвесь час быць напагатове, — згадвае пенсіянерка. — Але і падыход да іх заўсёды знаходзіла, раздойвала кожную кароўку ўручную, паступова прывучала да даільнага апарата. Калі якая з даярак спрабавала ўпікнуць большай зарплатай, я прапаноўвала памяняцца месцамі работы, — усміхаецца суразмоўніца. — Ніводная не згадзілася. А я прывыкла, уцягнулася і адпрацавала там дваццаць гадоў, пяць з іх пасля наступлення пенсійнага ўзросту. Яшчэ прасілі, але больш не згадзілася.

Цяпер заслужаны ветэран калгаснай вытворчасці займаецца толькі хатняй гаспадаркай. Старэйшыя дзеці жывуць у Кобрыне і Брэсце, малодшы — у Маскве. Летам у вясковай матчынай хаце бывае шумна і шматлюдна, гарадскія ўнукі не забываюць бабулю. «Вось якая прыгажуня», — паказвае бабуля здымак маскоўскай унучкі — дзяўчыны мадэльнай знешнасці. Па чысціні і парадку ў доме можна меркаваць, што нашчадкі клапоцяцца пра маму не толькі ўлетку. «Ну і гаспадарка не забывае, — адзначае пенсіянерка. — Гэтай восенню ўжо сто кілаграмаў збожжа прывезлі і матэрыяльную дапамогу да свята. У 83 гады толькі Богу дзякую, што яшчэ жыву, што дзяцей сустракаю на сваім парозе».

# «МУРАВЫ»

## развівае вытворчасць, пра ветэранаў






Фота Алены ДАЎЖАНОК.



Сям'я МАДЫЛІЦА. Сяргей працаваў старшым эканамістам па працы і зарплаце, а Аляксандра — бухгалтарам.

## Сям'я фінансістаў

**Сяргей Пятровіч МАДЫЛІЦА** шмат гадоў адпрацаваў старшым эканамістам у гаспадарцы. А трапіў на работу, можна сказаць, выпадкова, хоць родам ён з гэтых мясцін. Па маладосці шукаў рамантыкі, бачыў сябе мараком. Нават крыху папрацаваў на параходзе ў Ленінградскай вобласці. Пасля арміі хацеў вярнуцца туды. Спачатку прыехаў дадому на пабыўку, і тут папрасілі часова падмяніць падлікоўца. Падмяніў, ды так арганізаваў улік матэрыяльных каштоўнасцяў, што ранейшага не ўзялі назад, а Сяргея вельмі настойліва папрасілі прадоўжыць работу. Неўзабаве і сваю Аляксандру сустрэў. Яна на той час працавала бухгалтарам на цагельным заводзе. Стварылі сям'ю, многія гады працавалі разам у фінансавай сферы гаспадаркі.

— Крыху больш за 40 гадоў адпрацаваў эканамістам — з гонарам за мужа гаворыць **Аляксандра Мікалаеўна.** — Станаўленне гаспадаркі, яе росквіт, купля тэхнікі, укараненне новых тэхналогій — усё пры нас было. Разам радаваліся поспехам, кожны год калгас прыбаўляў у надоях, прывагах, не раз на ўрачыстых сходах гаспадарка атрымлівала пераходныя сцягі, нярэдка ўручалі ўзнагароды работнікам.

— Адна з самых высокіх сярэдніх зарплат у раёне была, — дапаўняе жонку муж. — Ды і цяпер яны не здаюць пазіцый, па ўсім відаць, працуе добрая каманда спецыялістаў... А мы былі здаровымі, маладымі, працавалі. Аднымі з першых у гаспадарцы купілі машыну «Жыгулі», заўсёды быў заўзяты аўтааматар. Толькі нядаўна перастаў вадзіць.

Па слядах бацькоў пайшлі і дзеці. Абедзве дачкі іх атрымалі эканамічную адукацыю, фінансістамі сталі і некаторыя з унукаў. Бабуля і дзядуля ўжо маюць чацвёра праўнукаў. Цэлая сцяна ў пакоі занятая фотаздымкамі нашчадкаў розных пакаленняў.

## Пасля сямігодкі — у калгас

**Лідзія Паўлаўна ПІЛЮЦІК** заўсёды была пявунняй, весялухай. Ехалі ў кузаве грузавіка лён ірваць, яна запявала, усе падхоплівалі, дадому ехалі таксама з песняй. «Цяпер песню не пачуеш на вуліцы, — са шкадаваннем гаворыць Лідзія Паўлаўна, — песні і музыка толькі ў навушніках цяперашняга пакалення. А ў нас песня звінела. Мы і на раённыя, абласныя святы ездзілі са сваім самадзейным калектывам, адным словам, весела жылі».



Лідзія ПІЛЮЦІК працавала загадчыкам калгаснага склада.

Па гэтай жанчыне і не скажаш, што дзяцінства ў яе было гаротным. Ёй было паўгода, як бацьку забілі немцы, маці не змагла змірыцца са стратай, захварэла і памерла, калі Лідачцы было ўсяго восем. Яна засталася са старэйшымі сёстрамі і бабуляй. Расказвае, што колькі сябе памятае, працавала: «Тады ўсе працавалі, як тыя мурашкі». Сёстры пайшлі замуж, а яна, малодшая, засталася ў бацькоўскай хаце. Тут і выгадавала сваіх дзяцей. Калгасную работу пачала адразу пасля заканчэння сямігодкі. Спачатку на паляводстве: буракі, лён, бульба. Тады была цяжкая праца ў полі. Потым яе, як старанную, адказную працаўніцу, паставілі загадваць калгасным складам, там і адпрацавала дваццаць гадоў да пенсіі.

Пяць гадоў, як аўдавела. Цяпер 81-гадовая жанчына даглядае ўласную невялікую гаспадарку. Праўда, зусім нядаўна ў куратнік панадзіўся тхор і за адну ноч знішчыў яе невялічкі курыны статак. Кажа, што навесну будзе зноў купляць курачак. А то ж сумна без жыўнасці. Агарод таксама садзіць: памідоры, агуркі любіць са сваіх градак, а не з крамы.

Цяпер, акрамя хатняй работы, у якасці трэніроўкі для розуму Лідзія Паўлаўна актыўна разгадвае сканворды, часам паўтарае вершы, якія добра памятае са школьных гадоў. Калі дзеці-ўнукі клічуць у госці, то выбіраецца, любіць наведваць розныя мясціны. Апошнім разам яшчэ да пандэміі ездзіла ў Кіеў, калі ўнучка першынца нарадзіла. Дачка ў Мінску жыве.



Сям'я ЖЭДЗЬ. Канстанцін працаваў трактарыстам, а Ніна была свінаркай на ферме.

## Механізатар і свінарка

**Канстанцін Фёдаравіч ЖЭДЗЬ** сорак гадоў быў калгасным трактарыстам, а пачынаў работу на гусенічным трактары. «Прыйдзе дадому — адны вочы свецяцца, увесь твар шэры ад пылу, — успамінае жонка **Ніна Пракопаўна.** — Тады была такая тэхніка. Цяперашнім механізатарам і ўявіць тое цяжка».

Канстанцін Фёдаравіч апошнім часам недачувае, за яго інтэрв'ю ахвотна дае жонка. Яна расказвае, што муж гадаваўся сіратою, малодшы з вялікай сям'і, у тры гады застаўся без бацькі. Скончыў курсы трактарыстаў, і ўсё жыццё адпрацаваў калгасным механізатарам. Работнікам быў, якіх пашукаць. Не раз адзначаўся ганаровымі граматамі, каштоўнымі падарункамі.

Ды і Ніна Пракопаўна не адставала, была ў ліку найлепшых жывёлаводаў, працавала свінаркай на ферме у Чапялях. Да гэтай пары памятае першую сваю ўзнагароду. Тады іх вазілі ў Пружаны на нейкую святочную нараду, ёй жа падарылі вялікую кашэміравую хустку.

Сваю гаспадарку Жэдзі трымалі заўсёды, раней дзве каровы было, шмат сена трэба было нарыхтаваць. Ды і іншай жывёлы хапала ў хляве. Свіней, дарэчы, трымалі да мінулага года. Усіх дзяцей-унукаў збіралі на свежыну. Дзеці пайшлі ў бацькоў — усе працаўнікі. Старэйшы сын ужо сорак гадоў шчыруе шафёрам. Дачка, акрамя асноўнай работы, рукадзеллем займаецца, падарыла маці квяцістыя дываны ўласнага вырабу.

— Пенсія ў нас добрая, усё ёсць, аўтакрама прадукты прывозіць. Гаспадарка нас таксама не забывае, радуемся, што калгас наш квітнее. Вяснойназіраем, як усе палі акуратна ўзараныя, своечасова засеяныя, рунеюць дружнымі ўсходамі, — гаворыць на развітанне Ніна Жэдзь.

## Былы аграном — староста вёскі

**Анатоль Васілевіч ЛІНЕВІЧ** прыйшоў у калгас імя Калініна ў 1986 годзе галоўным аграномам, яго перавялі сюды з іншай гаспадаркі.

— Калі прыйшоў, тут старшынёй быў яшчэ Валерый Падгурскі, а праз пару гадоў стаў цяперашні кіраўнік. Вось з Пятром Мікалаевічам мы адпрацавалі разам шмат гадоў. У агранома работа якая: як пачынаецца сяўба, з шасці раніцы — у полі, а дадому, бывае, каля апоўначы дабярэшся. Жонка, **Антаніна Мікалаеўна,** заўсёды разумела і падтрымлівала. Сама яна працавала дырэктарам школы.

У пасяўную агранам павінен быць на полі. Сяўба — аснова ўраджаю, дакладнае захаванне тэхналогій у многім залежыць ад чалавечага фактару, таму кантроль тут — абавязковая ўмова. Мы займаліся жытам, азімай пшаніцай, асвойвалі на сваіх палях новыя сарты, сачылі за навуковымі распрацоўкамі, — адным словам, працаваць было цікава, — згадвае былы агранам. — Трыцікале, напрыклад, мы толькі спрабавалі, насенне тады было не беларускай селекцыі, а замежнае. І ў нас не вельмі добра прыжывалася. Зразумелі потым, што трэба насенне адаптаваць да сваіх умоў. Так пазней і сталася. Цяпер гэтая культура, наколькі ведаю, дае добрыя ўраджаі як у нашай гаспадарцы, так і ў іншых.

Ужо дзесяць гадоў Анатоль Васілевіч на пенсіі. Але за аграрнымі справамі ў гаспадарцы, раёне, вобласці ўважліва сочыць. Ужо ў якасці пенсіянера адзначае вялікі клопат пра ветэранаў. Пра тое, як пасадзіць, выкапаць бульбу, унесці арганіку на ўласныя «соткі», людзі не хвалююцца. Анатоль Ліневіч, дарэчы, не пакідае грамадскую работу, некалькі гадоў таму яго абралі старастам вёскі Мурава.



Анатоль ЛІНЕВІЧ *(са сваёй унучкай)* працаваў галоўным аграномам. Дагэтуль бярэ актыўны ўдзел у жыцці прадпрыемства.

**Святлана ЯСКЕВІЧ, Алена ДАЎЖАНОК. Фота Аліны МАЗАВЕЦ.**

УНП 200027333

СБЕР БАНК

## Уважаемые Владельцы (физические лица)

**текущих (расчетных) счетов, в том числе с использованием банковской платежной карточки, благотворительных счетов (далее – Счет), открытых в ОАО «Сбер Банк» (далее – Банк), по которым отсутствуют операции в течение одного года (кроме зачисления процентов), не включая срока наложения ареста либо приостановления операций по Счету (далее – неактивные счета)!**

Сообщаем Вам, что в соответствии со ст. 206 Банковского кодекса Республики Беларусь, банк вправе прекратить обязательства по договору об открытии Счета при соблюдении и наступлении условий, предусмотренных указанной статьей, а также договором об открытии Счета.

Настоящим уведомляем Вас об отсутствии по Вашему Счету операций в течение одного года (кроме зачисления процентов), не включая срока наложения ареста либо приостановления операций по Счету, а также предупреждаем о прекращении обязательств Банка по соответствующим договорам по истечении шести месяцев, начиная с даты настоящего уведомления. Обязательства по договорам текущих (расчетных) счетов с использованием банковской платежной карточки, будут прекращены Банком по истечении шести месяцев со дня прекращения срока действия соответствующей банковской платежной карточки.

Если в течение 6 месяцев, начиная с даты настоящего уведомления, Вы не возобновите движение денежных средств по неактивному счету, Банк прекратит обязательства по соответствующему договору и закроет его, перечислив неиспользованный остаток денежных средств на отдельный счет без начисления процентов, и по истечении срока, установленного законодательством Республики Беларусь, зачислит его в доход Банка.

При этом Банк обязуется возвратить по требованию Владельца неактивного счета остаток денежных средств, находившихся на данном счете на момент его закрытия.

В отношении текущих (расчетных) счетов, открытых с 20.05.2020, а также текущих (расчетных) счетов, доступ к которым обеспечивается при использовании банковской платежной карточки, открытых с 05.05.2017, (далее – текущие счета) с 02.11.2020 Банком введен тариф за обслуживание таких счетов в случае отсутствия движения денежных средств на них при наступлении условий, предусмотренных договором об открытии текущего счета.

Операции по Счетам могут совершаться в подразделениях Банка и (или) в системе «Сбербанк Онлайн».

**Информацию о режиме работы подразделений можно получить по телефону:**
**148 – в стационарной и мобильных сетях**
**(+375 25/ 29/ 44) 5-148-148 –**
**в том числе для международных звонков.**

УНП 100219673

---

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» (продавец) в лице ликвидатора ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» – директора ООО «Модель антикризисного управления» Куценковой Н.С., извещает о проведении 25 января 2022 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 50 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

**ПОЛНЫЙ и ПОДРОБНЫЙ ПЕРЕЧЕНЬ ИМУЩЕСТВА (ЛОТЫ №№ 1–10, 11, 13, 15, 16, 18–26, 28–39, 41, 43–50, 52–56) опубликован в газете «Звязда» от 24.09.2021 г.**

**Продавец:** открытое акционерное общество «Жлобинский механический завод «Днепр», ул. Школьная, 8, 247210, г. Жлобин, Гомельская область. Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел. **8 (029) 303-53-09, Григорович Павел Карлович.** **Шаг аукционных торгов –** 5 (пять)% от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона.

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в российских рублях (RUB) – ПАО Сбербанк г. Москва, БИК 044525225, к/с 30101810400000000225 в ГУ Банка России по ЦФО, ИНН 7707083893. К/с 30111810800000000154, БИК BLBBBY2X, ОАО «Белинвестбанк», УНП 807000028, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № **(задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).**

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 13 января 2022 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 21 января 2022 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются.** Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения. **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того**, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату услуг (вознаграждение) по организации и проведению торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество, согласно договору купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента подписания договора купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с «Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденное Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 №16 (в ред. Постановления Совмина от 12.07.2013 № 607).

**Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 24.09.2021 г. №184 (29553). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона, полный список имущества с ценами размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 126-66-62, 8 (044) 599-18-16.**

---

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703** | | |
| **Продавец** | **ОАСО «Би энд Би иншуренс Ко», г. Минск, ул. Я. Коласа, 38. Тел.: + 375 29 688-04-88** | | |
| **Предмет аукциона** | | | |
| **Лот № 1.** Местоположение **– г. Минск, ул. Замковая, 33** | | | |
| **Офисная мебель и оргтехника в составе 437 единиц:** ПЭВМ, коммутаторы, кондиционеры, счетчики банкнот, копировальные аппараты, пожарная сигнализация, источники бесперебойного питания, компьютерная сеть, система симметричной связи, счетно-денеж. машинки, мебель, кабельная телефонная линия, системы вентиляции и кондиционирования воздуха, сейфы, комплекты перегородок, аппарат нагрева-охлаждения воды, рольшторы (полный перечень см. на сайте организатора аукциона **ipmtorgi.by**) | | | |
| **Начальная цена лота № 1 (с НДС 20 %) – 128 681,28 бел. руб.** (снижена на 30 %) **Шаг аукциона – 6 434,06 бел. руб.** | | | |
| **Лот № 2.** Местоположение – **г. Минск, ул. Лили Карастояновой, 32-19** | | | |
| Наименование (назначение) | | Общая площадь | Инвентарный номер |
| **Помещение санитарно-бытового назначения** | | 1,7 кв. м | 500/D-7028275 |
| **Начальная цена лота № 2 (с НДС 20 %) – 3 108,00 бел. руб.** (снижена на 30 %) **Шаг аукциона – 155,40 бел. руб.** | | | |
| **Лот № 3.** Местоположение – **г. Минск, ул. Замковая, д. 33-6** | | | |
| Наименование (назначение) | | Общая площадь | Инвентарный номер |
| **Административно-торговое помещение** | | 733,5 кв. м | 500/D-7023833 |
| **Начальная цена лота № 3 (с НДС 20 %) – 1 624 560,00 бел. руб.** (снижена на 30 %) **Шаг аукциона – 81 228,00 бел. руб.** | | | |
| **Лот № 4.** Местоположение – **г. Минск, ул. Замковая, д. 33-1а** | | | |
| **Кабинеты** (административное помещение) | | 87,9 кв.м | 500/D-708041778 |
| Составные части и принадлежности: открытая автостоянка пл. 523 кв. м | | | |
| **Начальная цена лота № 4 (с НДС 20 %) – 289 800,00 бел. руб.** (снижена на 30 %) **Шаг аукциона – 14 490,00 бел. руб.** | | | |
| ***Сведения о земельном участке по лотам № 3 и № 4:*** пл. **0,1469 га** предоставлен продавцу на праве общего долевого постоянного пользования (доля: 17/50) для эксплуатации и обслуживания административного здания с магазином. ***Ограничения (обременения) прав:*** после продажи земельный участок будет разделен в долях с установлением сервитута | | | |

| | |
|---|---|
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа: ООО «ИПМ-Консалт оценка» | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10 (десять) рабочих дней** после проведения аукциона |
| **Условия оплаты предмета аукциона:** предмет аукциона должен быть оплачен покупателем в течение **20 (двадцати) рабочих дней** со дня проведения аукциона | |
| **Порядок ознакомления:** в рабочие дня по предварительному согласованию +375 (29) 680-80-99 (Шубко Юлия Владимировна) | |
| **Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, в том числе документ, подтверждающий внесение задатка с отметкой банка, в размере 10 % от начальной цены предмета аукциона, зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **ipmtorgi.by** | |
| В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику, по начальной цене, увеличенной на 5 % | |
| Победитель аукциона либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, а также оплатить вознаграждение организатору аукциона, исчисляемое в процентном соотношении от цены продажи (4 % – по лотам № 1, 2; 2 % – по лоту № 3, 3 % – по лоту № 4) в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения аукциона | |
| Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликованы в газете «Звязда» от 15.12.2021 | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия | |
| **Дата и время проведения аукциона** | **28.01.2022 в 13.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка» |
| **Дата и время начала и окончания приема заявлений** | **С 09.00 13.01.2022 до 17.00 27.01.2022** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка» |

**Контактные телефоны: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06.**
**E-mail: auction@ipmconsult.by**

---

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельский ликеро-водочный завод «Радамир» (продавец) извещает о проведении 27 января 2022 года открытого повторного аукциона со снижением цены по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС, бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **Местонахождение лотов №№ 1, 4–9:** г. Гомель, ул. Войсковая, 16 | | | |
| 1 | **Грузовой бортовой тентовый MAZ 437143 332, рег. № AI 1171-3**, номер кузова (рамы) Y3M437143B0000930, 2011 г. в., состояние удовлетворительное, пробег – 443 082 км | **5 115,00** | 255,75 |
| 2 | **Грузовой самосвал GAZ -3507**, **рег. № AK 7223-3**, номер кузова (рамы) XTH531400L1351479, цвет – темно-синий, 1990 г. в., состояние удовлетворительное, пробег – 45 184 км. **Местонахождение:** Гомельская обл., Речицкий р-н, д. Солтаново, ул. Заводская, 6 | **1 419,00** | 70,95 |
| 3 | **Экскаватор ЭО-2621В**, **рег. № 9526 ГТ**, 1987 г. в., двигатель – дизельный, шасси №556010. **Местонахождение:** Гомельская обл., Речицкий р-н, д. Солтаново, ул. Заводская, 6 | **2 178,00** | 108,90 |
| 4 | **Грузовой бортовой тентовый MAZ 437143 332**, **рег. № AI 0666-3**, 2011 года выпуска, номер кузова (рамы) Y3M437143B0000921, цвет – белый, состояние – удовлетворительное, пробег – 468 179 км | **14 520,00** | 726,00 |
| 5 | **Грузовой бортовой тентовый MAZ 437143 332**, **рег. № AI 0667-3**, 2011 года выпуска, номер кузова (рамы) Y3M437143B0000922, цвет – белый, состояние – удовлетворительное, пробег – 474 209 км | **14 520,00** | 726,00 |
| 6 | **Грузовой бортовой тентовый MAZ 437143 332**, **рег. № AI 1169-3**, 2011 года выпуска, номер кузова (рамы) Y3M437143B0000929, цвет – белый, состояние – удовлетворительное, пробег – 470 102 км | **10 890,00** | 544,50 |
| 7 | **Грузовой бортовой тентовый MAZ 5340A5-370-010**, **рег. № AI 1238-3**, 2011 года выпуска, номер кузова (рамы) Y3M5340A5B0000241, цвет – белый, состояние – удовлетворительное, пробег – 488 522 км | **9 515,00** | 475,75 |
| 8 | **Грузопассажирский фургон GAZ -2705**, **рег. № AE 6448-3**, номер кузова (рамы) 270500A0441195, цвет – темно-синий, 2010 г. в., состояние удовлетворительное, пробег – 48 255 км | **3 102,00** | 155,10 |
| 9 | **Грузовой специальный фургон изотермический GAZ-3309 «BELAVA 02»**, **рег. № AK 9980-3**, номер кузова (рамы) Y39850000C0094018, цвет – белый, 2012 г. в., состояние – удовлетворительное, пробег – 469 235 км | **5 412,00** | 270,60 |

**Продавец:** ОАО «Гомельский ликеро-водочный завод «Радамир», г. Гомель, ул. Севастопольская, 106. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.:** 8 (0232) 25-49-97, 8 (033) 372-87-77 – начальник транспортного цеха Туманов Александр Николаевич. **Шаг аукционных торгов – 5 %.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «Гомельский ликеро-водочный завод «Радамир»):** р/с BY86 BLBB 3012 0400 0783 1600 1007 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНН 400078316, БИК BLBBBY2X, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 13 января 2022 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 25 января 2022 г. в 16.00. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения.** В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти)** рабочих дней со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату за услуги (вознаграждение) по организации и проведению торгов, затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **20 (двадцати) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество, согласно договору купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

**Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 23.04.2021 г. № 76 (29445), № 144 (29513) от 30.07.2021 г., от 09.09.2021 г. № 173 (29542). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 126-66-62, 8 (044) 599-18-16.**

---

## Извещение о проведении 16 февраля 2022 года аукционных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДОРОРС»

| Наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества | Сведения о земельном участке | Начальная цена, бел. руб., с учетом НДС | Размер задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **Сведения о продаваемом имуществе** | | | |
| Капитальное строение с инв. номером 500/С-44605 общей площадью 843,8 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Суражская, 15, наименование – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ (литер А1/к, д), назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, составные части и принадлежности: литер а – площадка, литер б – ограждение, литер в – железнодорожные пути | Право аренды на земельный участок площадью 0,3087 га, кадастровый номер – 500000000005003710, по 31.03.2022 | 622 800,00 | 62 200,00 |
| **Недвижимое имущество выставлено на торги по фактическому состоянию, техническим характеристикам и комплектации, рекомендуется осмотр** | | | |

**Продавец имущества:** ОАО «ДОРОРС», ул. Брестская, 77/1-2, 220099, г. Минск.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

**Условия торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 2 процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДОРОРС», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» р/с BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, назначение платежа – задаток для участия в аукционных торгах от 16.02.2022.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **16 февраля 2022 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб.7 (зал аукционов). Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 17.01.2022 по 14.02.2022** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К.Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу ознакомления с продаваемым имуществом следует обращаться по телефону: (017) 240-62-06.

**Телефоны для справок:** (017) 360-42-22, 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); (017) 240-62-06 (ОАО «ДОРОРС»).

Дополнительная информация размещена на сайте **www.mgcn.by** в разделе «Недвижимость в собственность».

# Прыцягальнасць «Пунсовых пагонаў»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

У незнаёмага з тэмай чалавека адразу ўзнікае пытанне: «І чым жа вы не падобныя на іншых?» Адказ — у асаблівым стаўленні да гісторыі нашай краіны. У вучылішчы дзейнічае пошукавы клуб «Пунсовыя пагоны», пра які хочацца расказаць падрабязней.

З'явіўся ён у выніку настойлівасці і зацятасці педагогаў. Кіраўнік — Павел Уладзіміравіч. Клуб мае права непасрэдна ўдзельнічаць у палявых работах пошукавага батальёна. Асноўнай мэтай яго стварэння было аднаўленне імёнаў і пошук салдат, якія аддалі сваё жыццё за Радзіму і нашу светлую будучыню. Дзейнасць «Пунсовых пагонаў» заключаецца ў рабоце з архіўнымі звесткамі, супрацоўніцтве з пошукавымі арганізацыямі і, вядома ж, палявых работах. Часцей за ўсё аб'ектамі раскопак з'яўляюцца лясы, лугі і палі. Нягледзячы на гарачае лета (асноўны час працы), хлопцы выкладваюцца «на ўсе сто», бо разумеюць важнасць сваёй місіі. Страшна падумаць аб тым, колькі яшчэ невядомых салдат, на жаль, ляжаць у халоднай зямлі, у безназоўных балотах, удалечыні ад дома і сям'і. Кадэты ж паважліва ставяцца да памяці загінулых, праводзяць жалобныя мерапрыемствы па перапахаванні герояў Вялікай Айчыннай вайны. Напрыклад, адна з такіх цырымоній праходзіла ў аграгарадку Пірэвічы, дзе знойдзеныя астанкі былі перанесены ў храм для правядзення паніхіды.



Вынік дзейнасці клуба — 213 перапахаваных чырвонаармейцаў і 873 устаноўленыя імёны. Кожны з іх — чыйсьці сын, муж ці бацька. Атрыманая інфармацыя неверагодна важная для сем'яў, якія паважаюць свае карані. Амаль усе рэчы, якія знаходзяцца ў музеі, — гэта знаходкі ўдзельнікаў клуба.

***— А куды ідуць навучэнцы пасля 11 класа?*** — пацікавіліся мы.

— Перш за ўсё, на ваенныя спецыяльнасці любых ВНУ краіны (за рэдкім выключэннем). Нашы выпускнікі вучацца ў БДУ, БНТУ, БДУІР, ГрДУ і іншых навучальных установах. Некаторыя — у Расіі: у Маскве, Санкт-Пецярбургу, Разані, Чарапаўцы.

У вучылішчы пануе асаблівая атмасфера. Пражываюць і вучацца тут дзеці і падлеткі з розных куткоў вобласці, з раённых цэнтраў і Гомеля. Знаходзячыся тут, мы паспелі паразмаўляць і з кадэтамі. Было вельмі цікава даведацца падрабязней пра іх побыт і вучобу.

***— Ці ёсць у вас вольны час?***

— Вядома, ёсць. На выхадных ходзім у басейн, займаемся гаспадарчымі справамі, самападрыхтоўкай, нават скачам з парашутам. Прагулкі за тэрыторыю (звальняльныя) трэба заслужыць вучобай і паводзінамі.

***— Як справы са смартфонамі і інтэрнэтам?***

— З гэтым усё строга. Смартфоны забаронены, мець можна толькі кнопкавы тэлефон без камеры. Яны выдаюцца на 30—45 хвілін увечары, каб патэлефанаваць бацькам. З часам да гэтага прызвычайваешся. Што датычыцца інтэрнэту, доступ да яго дазволены з камп'ютараў у інтэрнаце ці самім вучылішчы. Ён выкарыстоўваецца для падрыхтоўкі рэфератаў і розных дадатковых матэрыялаў.

***— Колькі часу вы аддаяце вучобе?***

— Шмат. У дзень звычайна па шэсць урокаў, а да паўсёмай вечара займаемся «дамашкай». Ёсць факультатывы і заняткі на платнай аснове.

***— Пра што думае падлетак перад тым, як паступіць сюды?***

— Ён павінен выбраць свой жыццёвы шлях. Калі хоча служыць, быць афіцэрам або займаць кіраўнічую пасаду, то, вядома, паступіць у кадэцкае вучылішча.

***— Што больш за ўсё падабаецца?***

— Хоць навучанне тут і адрозніваецца ад астатніх устаноў адукацыі, аднак, калі мы выпускаемся, то па ўзроўні ведаў знаходзімся на галаву вышэй за іншых. Тут асаблівы ўпор робіцца менавіта на вучобу, на вайсковую службу.

На працягу размовы мы пераканаліся, што кадэт — гэта не толькі ўзорны вучань, але і цікавы суразмоўца. Заўсёды ёсць да чаго імкнуцца, і наша паездка паказала менавіта гэта.

**Аляксандр ВЕСЯЛОЎ,**
**вучань 10 класа СШ № 11 г. Мазыра,**
**член клуба «Юны журналіст»**

*Моладзь і права*

# У ЧЫМ СІЛА? У АСНОЎНЫМ ЗАКОНЕ

**Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі і Мінская гарадская калегія адвакатаў заключылі пагадненне аб супрацоўніцтве.**



Прадметам дамоўленасці стала сумесная дзейнасць па павышэнні прававой асветы і інфармаванасці моладзі аб нормах заканадаўства Беларусі. У прыватнасці, бакі маюць намер арганізоўваць для юнакоў і дзяўчат сумесныя форумы, розныя навучальныя мерапрыемствы для растлумачэння палажэнняў дзейнага заканадаўства і змяненняў у ім, аказваць кансультацыйную дапамогу.

Падпісваючы пагадненне, **першы сакратар Цэнтральнага камітэта БРСМ Аляксандр ЛУК'ЯНАЎ** адзначыў, што важна аб'ядноўваць намаганні ў абмеркаванні з моладдзю прапанаваных змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю. «Мяркую, што сумесныя намаганні ў першую чаргу будуць скіраваны на арганізацыю работы маладзёжных дыялогавых пляцовак, дзе разам з хлопцамі і дзяўчатамі будзем абмяркоўваць праект змяненняў і дапаўненняў у Асноўны Закон, тлумачыць кожнаму маладому чалавеку важнасць праяўляць грамадзянскую пазіцыю. Мы ўжо запусцілі па ўсёй краіне серыю адкрытых дыялогаў «Сіла закона», на якіх эксперты разам з дзецьмі абмяркуюць усе ўнесеныя ў Канстытуцыю змяненні, — сказаў ён.

**Старшыня Мінскай гарадской калегіі адвакатаў Аляксей ШВАКОЎ** дапоўніў, што арганізацыя вельмі зацікаўлена ў супрацоўніцтве з БРСМ. «Час няпросты. Шмат пытанняў у моладзі цяпер. Мы павінны дапамагаць маладым людзям разбірацца ў тым, што адбываецца. Нам трэба больш размаўляць з імі, тлумачыць правы і абавязкі, накіроўваць, каб пяпярэдзіць магчымыя наступствы неабдуманых дзеянняў», — падкрэсліў Аляксей Швакоў.

Дарэчы, прапановы па абноўленай Канстытуцыі любы грамадзянін можа ўнесці і праз анлайн-прыёмную БРСМ. Саюз моладзі акумулюе ўсе прапановы і дапаўненні, што паступаюць, і накіруе іх у Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі.

Нагадаем, пасля 44-га з'езда, які прайшоў 12 жніўня мінулага года, у адпаведнасці з прынятай стратэгіяй развіцця Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі прававое выхаванне стала новым і адным з ключавых напрамкаў дзейнасці БРСМ.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

*Лакацыі актыўнасці*

# ЗНОЎ У ДАРОГУ КЛІЧА «ЗОРНЫ ПАХОД»

**У час зімовых канікул (з 26 да 28 студзеня) студэнты БДПУ адправяцца ў 57-ы інтэрнацыянальны «Зорны паход» па месцах баявой і працоўнай славы беларускага народа.**

Ідэя правядзення «Зорных паходаў» нарадзілася ў 1965 годзе, калі студэнты тады яшчэ Мінскага педагагічнага інстытута ўзялі ўдзел ва Усесаюзным паходзе моладзі па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы савецкага народа. Яны адправіліся з розных населеных пунктаў краіны, але на карце схема маршруту па форме нагадвала зорку, што і падарыла зімоваму паходу назву «Зорны».




Плануецца, што дзесяць атрадаў (больш за 300 студэнтаў і выкладчыкаў) за тры дні наведаюць у Мінскай вобласці Барысаўскі, Дзяржынскі, Крупскі, Мядзельскі, Слуцкі і Стаўбцоўскі раёны, у Брэсцкай вобласці — Івацэвіцкі раён і ў Гомельскай — Светлагорскі.



Падчас паходу студэнты і выкладчыкі сустрэнуцца з ветэранамі вайны і працы, правядуць мітынгі і ўскладуць кветкі да брацкіх магіл воінаў і мірных жыхароў, якія загінулі ў гады вайны, ва ўстановах адукацыі правядуць прафарыентацыйныя сустрэчы са старшакласнікамі, арганізуюць майстар-класы, трэнінгі і спартыўныя спаборніцтвы, выступяць з канцэртнымі праграмамі для навучэнцаў і жыхароў рэгіёнаў.

Разам з беларускімі студэнтамі ў «Зорным паходзе» прымуць удзел студэнты з Арменіі, Казахстана, Расіі, Таджыкістана і Узбекістана.

А старт паходу будзе дадзены падчас урачыстага мітынгу, які пройдзе 25 студзеня каля помніка студэнтам і выкладчыкам, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, ва ўнутраным дворыку БДПУ. Гэта ўжо стала шматгадовай традыцыяй.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*Новыя старты*

# Вабіць Сінявокая турыстычная

**Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі запрашае хлопцаў і дзяўчат да ўдзелу ў рэспубліканскім конкурсе «Welcome to Belarus».**

Новы творчы праект накіраваны на развіццё творчых здольнасцяў і інтарэсаў маладых грамадзян Беларусі, папулярызацыю культурнага і турыстычнага патэнцыялу нашай краіны.

Да ўдзелу ў конкурсе запрашаюцца актыўныя карыстальнікі суполкі TikTok з адкрытымі профілямі ва ўзросце ад 14 гадоў да 31 года. Задача канкурсантаў — ствараць і размяшчаць у сваіх акаўнтах кароткія мабільныя відэа на тэму турыстычнай прывабнасці Беларусі з выкарыстаннем гуку Belarusis beautiful — 2021 («Наша зямля»).

БРСМ плануе падвесці вынікі конкурсу да 1 сакавіка. Журы ацэніць творчыя работы, апублікаваныя да 14 лютага, якія суправаджаюцца хэштэгамі #belarus і #БРСМ і абавязковай пазнакай афіцыйнага акаўнта @ brsm_life.

Пераможца будзе вызначаны па найвялікшай колькасці лайкаў і праглядаў. З падрабязнымі ўмовамі конкурсу можна азнаёміцца на сайце БРСМ.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

SEX-БАЛЯСЫ

# грымАСЫ прыматаў

**Ужо не раз прызнаваўся, што адна з любімых тэм нататак — людзі і жывёлы. Гэта калі ў паводзінах апошніх бачыш нейкія чалавечыя рысы, а, гледзячы на першых, часам параўноўваеш іх з братамі нашымі меншымі. («Насамрэч жанчыны не баяцца мышэй. Гэта яны так эмацыянальна рэагуюць на футра».) Сёння пагаворым пра людзей і прыматаў, таму што тут максімальна і «грым» падобны, і сваіх «асаў» з абодвух бакоў хапае. Не верыце? Вось вы ведалі, што бабуіны знайшлі добры спосаб для расставання? («Мая былая збегла з маім найлепшым сябрам. Хоць я ўвогуле з ім не знаёмы. Але цяпер ён мой найлепшы сябар».) Як высветлілася, гэты працэс не з'яўляецца ўнікальным чалавечым феноменам, разрыў пар здараецца і сярод прыматаў. («Адны жанчыны хвалююцца, што муж прыходзіць занадта позна, а іншыя — што ён прыходзіць занадта рана».)**



Калі група становіцца занадта вялікай, жывёлы прымаюць рашэнне падзяліцца. Навукоўцы высветлілі, што гэта адбываецца ў супрацоўніцтве, а не па капрызе важака. («— Мы павінны расстацца... Ты чэрствая, самаўлюбёная, эгаістычная, цынічная сцерва!» — «Ну, гэта зразумела. А расстаёмся ж чаго?») Адзначаецца, што, як і ў чалавечым свеце, працэс расстання можа заняць месяцы ці нават гады, паколькі ў групе вядуцца сур'ёзныя перамовы аднosна будучыні. («— Хачу завесці ката». — «Слухай, кот — гэта сур'ёзна, на ўсё жыццё. Спярша паспрабуй ажаніцца».) Агрэсіўныя асобіны, якія не могуць бясшкодна для іншых разбураць сацыяльныя сувязі, у выніку застаюцца адны. Таму перамовы асабліва важныя, каб у будучыні ў бабуіна былі сябры і сям'я, з якімі яму будзе лягчэй выжыць. («— Паслухайце, сусед, як вы толькі ўсё гэта церпіце? Ваша жонка ўвесь дзень лаецца, б'е посуд, крычыць на сабаку!» — «Гэта што? Нашмат горш, калі яна ў цудоўным настроі і пачынае спяваць».)

А пра эксперымент з капуцынамі чулі? Насамрэч ён і пра людзей таксама. Дзвюх малпачак саджаюць у суседнія клеткі і вучаць выконваць найпрасцейшую работу: ім закідваюць каменьчык, а іх задача — вярнуць яго назад. За гэта належыць узнагарода — кавалачак агурка. («— Вось мы ажэнімся, я буду гатаваць і прыбірацца. А ты што будзеш рабіць?» — «Я буду есці мяса». — «А з карыснага?» — «А з карыснага — гародніну».) У нейкі момант адной з жывёл даюць вінаград. Гэта адбываецца на вачах суседкі, якая толькі што атрымала свой звычайны агурок. Рэакцыя малпы наглядна паказвае ўсе яе пачуцці ад таго, што адбываецца: непрыкрытая крыўда і абурэнне ад пачуцця несправядлівасці. («Хітрае немаўля даплаціла буслу, які яго нясе, 200 «баксаў» і стала грамадзянінам Швецыі».) Чаму гэта і пра нас? Мы таксама хвалюемся не з-за таго, што наш тэлефон нечакана ператвараецца ў барахло, а таму што выйшаў новы Iphone. Наш стаў горшым толькі ў параўнанні. («Ты загнаў мяне сваім пытаннем у гугл».) Жывёлу падражнілі вінаградам, як нас дражняць рэкламай і вобразамі паспяховых людзей у сацыяльных сетках. («— Каханая, я падару табе самую яркую зорку ў небе!» — «А можа лепш футра?» — «Не лепш. У мяне да цябе высокія пачуцці».) Самае ж страшнае здарылася тады, калі гэты смачнейшы прыз аддалі суседцы. За што? За тыя ж дзеянні?! Нават жывёла жадае роўнай узнагароды за аднолькавую працу. («Толькі стаўшы маці, разумееш, што мульцік пра малпачак зусім не смешны...»)

Сумесны прагляд фільмаў збліжае шымпанзэ гэтаксама, як і людзей. Жывёлы, якія разам глядзяць стужкі, адчуваюць пачуццё блізкасці, падобнае на эмоцыі людзей. Раней лічылася, што такая рэакцыя ўласцівая толькі чалавеку. («Жонка знайшла заначку мужа з надпісам «Для любімай». З замілаваннем даклала туды яшчэ 50 рублёў і вярнула грошы ў схованку. Праз некалькі дзён муж купіў новыя колы для машыны».) Пасля «кінасеанса» малпы часцей заставаліся разам і ішлі на тактыльны кантакт. («Хлопчык ужо другую гадзіну сядзеў на дрэве ў парку і крычаў: «Здыміце мяне, здыміце мяне...» І ўсе добрыя людзі адразу ж даставалі свае смартфоны і здымалі яго».) Каб пераканацца ў тым, што шымпанзэ сапраўды глядзелі фільмы, выкарыстоўвалі прыбор для адсочвання руху вачэй. Каля экранаў малпаў утрымлівалі садавіна і напоі. («Дзікуны лічылі, што фотаапарат можа ўкрасці душу ў таго, каго здымалі. «Інстаграм» даказаў, што яны мелі рацыю».) «Здольнасць перажываць і дзяліцца сумесным вопытам стварае паміж людзьмі пэўную сувязь, — сказаў адзін з аўтараў даследавання. — Аказалася, што гэты працэс мае больш глыбокія эвалюцыйныя карані, чым прынята лічыць». («Сярожа, як ваша прыгажуня?» — «Масла трэба мяняць... Ці вы пра Ганначку?»)

У лесе на Барнэа арангутан заўважыў мужчыну, які стаяў па грудзі ў вадзе, і ў прамым сэнсе працягнуў яму руку дапамогі. («Сяброўства паміж мужчынам і жанчынай прыкметна слабее з надыходам вечара...») Кранальныя кадры паспеў зрабіць фатограф-аматар. («Першае правіла ката. Будзь раскошным. Заўсёды. Паўсюдна».) Ад дапамогі жывёлы мужчына адмовіўся. («Дзякуй! Кахаць трэба ўсіх падрад! Бог убачыць, што ты стараешся, і пашле добрага мужа».) «Гэта дзікая жывёла, — растлумачыў рабочы фатографу. — Паводзіны арангутана могуць быць непрадказальныя. Да таго ж яны не павінны прывыкаць да людзей». («Прабач, але я не буду займацца сексам да вяселля». — «Ты таксама прабач, але я не буду ладзіць вяселле дзеля сексу».) Вось такія яны, грымасы ад людзей і прыматаў...

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «Сімбіёз шансона і балалайкі»

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Святлана звязана з музыкай таксама з маленства. Яна прыгадвае, як станавілася каля люстэрка, брала расчоску і ўяўляла, быццам бы трымае мікрафон, спявала песні, рабіла дзённікі, запісвала тэксты. Тады дзяўчынка не бачыла сябе ні ў якай іншай прафесіі, акрамя спявачкі. «Пасля ўжо зразумела, што для гэтага трэба ведаць ноты». Музычную школу не заканчвала, бо там, дзе я вырасла, яе не было», — канстатуе артыстка. Святлана ўдзельнічала ва ўсіх школьных мерапрыемствах, і калі надышоў час паступаць, выбрала Гродзенскі педагагічны каледж. Вучылася на музычным аддзяленні, атрымала спецыяльнасць дырыжора, харавіка і музычнага кіраўніка. Аднак гэтага дзяўчыне было мала — вырашыла ісці ва ўніверсітэт імя Янкі Купалы. Паступіла на той жа факультэт мастацтва і дызайну, што і Аляксандр, пасля перавялася на факультэт народнай творчасці, бо, як гаворыць сама спявачка, інструмент для яе быў не настолькі важны, як вакал. «Вывучаючы акадэмічныя спевы ў каледжы, пасля два гады ва ўніверсітэце, я пачала спасцігаць народную манеру выканання, іншымі словамі, фарміравала крыху іншую падачу ў голасе», — дзеліцца Святлана.

Менавіта калі дзяўчына пераводзілася з адной спецыяльнасці на іншую, трапіла на адзін курс з Сашам — так і адбылося іх знаёмства. Маладыя людзі адразу пасябравалі і прасядзелі за адной партай увесь час навучання. Святлана ўспамінае, як пісала для свайго суседа курсавыя, перапісвала за яго канспекты, пакуль віртуоз Варанішча гастраляваў. Студэнтам ён ездзіў выступаць у Маскву на перадачу «Аншлаг», іграў на «Славянскім базары», даваў сольныя канцэрты.

«Мяне заўсёды не было, яна ўсё рабіла за мяне», — смяецца Аляксандр і прыгадвае, як потым разам працавалі ў ансамблі танца, музыкі і песні «Белыя росы», у абласной Гродзенскай філармоніі пачыналі сольную праграму, з якой ездзілі па гарадах.

Паміж сужэнцамі няма месца для творчага саперніцтва. На іх думку, яны дапаўняюць адно аднаго ў творчасці: Аляксандр іграе не толькі сольна — акампануе Святлане, яна ж спявае ў дуэце, сольна, выконвае не толькі ролю артысткі, але і стыліста, і касцюмера, з-за няхваткі часу пачала выступаць як вядучая мерапрыемстваў. Артыстка расказвае, што паралельна з вучобай ва ўніверсітэце займалася эстраднымі спевамі пры гарадскім цэнтры культуры. «Карацей, мне трэба было паспрабаваць усё, — згадвае яна. — І на цяперашні момант для сябе я сфарміравала такі жанр, як народны шансон, — сінтэз народнага, эстраднага, дзесьці акадэмічнага вакалу, так бы мовіць, стварыла такі сімбіёз», — тлумачыць вакалістка. У такім жанры і падачы Святлана выконвае свае аўтарскія песні. Яны ў асноўным пра жыццё і каханне. Вядомы стэрэатып, што жанр шансона — для абмежаванага кола людзей, спявачка імкнецца зняміць, надаючы кожнаму свайму твору пэўнае эстраднае адценне.

У пары ёсць і сольныя, і сумесныя нумары. Дуэт сям'і Варанішчаў нарадзіўся ў 2018-м з іх кампазіцыі «Балалаечнік». Якраз у год нараджэння сына Уладзіслава Святлана натхнёна пачала пісаць свае аўтарскія кампазіцыі, у дэкрэце з'явілася дзевяць песень. Аляксандр успамінае, як Уладзіку было два годзікі, калі ён выйшаў упершыню з імі на сцэну. «Гэта было выступленне ў санаторыі. Сыночак вытрымаў цэлую гадзіну», — усміхаецца малады бацька.



Сям'я Варанішчаў: Святлана, Аляксандр і маленькі Уладзік.

Цяпер песні сямейнага дуэта можна пачуць на радыёстанцыях і ўбачыць на ТБ «Шансон» — найбольш вядомыя з іх «Трэці тост», «Ты і я», «Мілы мой», «Неба», «Сям'я Варанішчаў, альбо Песня нас знойдзе». Апошняя была створана ў 2018 годзе, а ў 2020-м гэта кампазіцыя дапамагла пры ўдзеле ў гарадскім сямейным конкурсе «Брэнд маёй сям'і», дзе музыканты занялі першае месца.

У пары ёсць свой дом за горадам, дзе, дарэчы, размяшчаецца і студыя, там яны любяць праводзіць час, пачынаючы з ранняй вясны і да позняй восені. «Цяпер канцэртаў няма, дома займаюся музыкай гадзіну-дзве, зараз вось жонка прыехала, рыхтуе новую песню, — расказвае Аляксандр, — трэба ёй бэк-вакал напісаць, а яна мяне будзе рыхтаваць». Святлана дадае, што ў сярэднім спевамі займаецца гадзіну, каб не стаміўся голас, спыняецца на асноўных момантах, таму пара рэпеціруе з перапынкамі. А ўвогуле, лічыць яна, нават для рэпетыцый неабходна натхненне.

Паўтара года таму Аляксандр ездзіў на «Петрасян-шоу», здымаўся ў Рэгіны Дубавіцкай, выступаў са Святаславам Ешчанкам. Дома, у Беларусі, дуэт сям'і Варанішчаў запрашаюць у музычныя школы, каб паказаць сваё майстэрства, стаць прыкладам для маладых творцаў, сваёй творчасцю дуэт упрыгожвае гарадскія і рэспубліканскія святы.

Галоўнае, чаго жадаюць Аляксандр і Святлана, каб у душах людзей пасля іх канцэртаў заставалася адчуванне радасці і пазітыву. «Хочацца, каб людзі прыходзілі на канцэрты, а пасля неслі дамоў добрыя думкі, хочацца дарыць усмешкі, для гэтага творчасць і існуе», — гаворыць Святлана.

Цікава, а колькі патрэбна балалаек для віртуознай ігры і сапраўднага шоу? «У мяне іх шэсць, — адказвае музыкант, — дзве электрабалалайкі, яны зручныя для эстрадных канцэртаў, і тры акустычныя — на іх я іграю класіку пад раяль і выкарыстоўваю ў студыі гуказапісу. Адна імянная — што тата тады прынёс з крамы, яна была ўсюды са мной, нават падчас службы ў арміі. Памятаю, у нас там яшчэ і баяніст быў, спявалі ваенныя песні. Так што са мной у пяхоце быў не толькі кулямёт, але і балалайка. Цяпер яна адрэстаўрыраваная і знаходзіцца на нашай «фазэндзе». Вісіць на сценачцы, на ёй напісана «Аляксандр Варанішча». Напэўна, пасля маёй смерці яна будзе дарага каштаваць» (*смяецца*).

Напрыканцы нашай размовы пытаюся ў суразмоўнікаў наконт піяру і рэкламы. Аказваецца, нядаўна ў іх з'явіўся свой канцэртны дырэктар — Алеся Кузняцова з Мінска. Раней прыходзілася займацца прасоўваннем адно аднаго самім.

У Варанішчаў шмат планаў, у 2019-м яны многа працавалі, быў шчыльны графік, аднак разагнацца як след не дала пандэмія. Але, як кажуць самі артысты, не сумуюць. Цяпер музыканты думаюць наконт выпуску першага сумеснага дыска, шмат над гэтым працуюць, марыць адкрыць сваю студыю.

**Надзея ЗУЕВА.**
**Фота з архіва герояў.**

ЧЫРВОНКА. Чырвоная змена
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 311 17 41.
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.
Тыраж 14.804.
Нумар падпісаны ў 19.30 12.01.2022 г.

Спажывец

# ІДЗЁМ ПА КРУПЫ

## Пачым сёння любімая грэчка і моднае кіноа?

**Крупы складаюць каля 40 % здаровага рацыёну. Гэта складаныя вугляводы, вітаміны групы B, якія не даюць упасці ў дэпрэсію, і энергія для жыццёвых здзяйсненняў. Апошнім часам кашы любіць модна — за іх выступаюць дыетолагі (крупы чысціць арганізм ад шлакаў і таксінаў), імунолагі (многія крупы ўмацоўваюць імунную сістэму) і аматары здаровага спосабу жыцця (ЗСЖ). Акрамя таго, крупы — гэта досыць танна: па кішэні чалавеку з любым дастаткам.**



### БЮДЖЭТНЫЯ

— Самыя запатрабаваныя пакупнікамі крупы — гэта, вядома, рыс і грэчка, — распавяла Таццяна Жукавец, прадавец аднаго з гіпермаркетаў сталіцы. — Астатнія крупы раскупляюцца больш павольна.

**Ячныя крупы** ў нас недалюбліваюць. Хтосьці вынес гэтую нелюбоў са школьнай сталовай, хтосьці — з армейскай. На самай справе гэтыя крупы могуць быць вельмі смачнымі, не кажучы ўжо пра іх карыснасць. Ячныя крупы змяшчаюць цэлы комплекс карысных рэчываў (вітамінаў і мінералаў), дзякуючы якім падтрымліваюць правільны абмен рэчываў, нармалізуюць кровазварот і супакойваюць нервовую сістэму. У пачатку мінулага стагоддзя ячныя крупы дзялілі на «звычайныя», «галандскія» і «напаўгаландскія» ў залежнасці ад велічыні зерня: чым меншы яго дыяметр, тым больш цаніўся прадукт. Самыя дробныя ячныя крупы мелі назву «каралеўскія». У савецкія часы зыходзячы з памеру зярнятак крупам прысвойваўся нумар. № 1 і № 2 — самае буйное зерне, № 3, № 4 — адпаведна, меншае, і № 5 — самыя дробныя зярняткі. У нашы дні гэтая класіфікацыя захавалася — менавіта так ячныя крупы выпускаюць вытворцы і сартуюць тавараздаўцы. Ячныя крупы спажывец часцей абірае з дробнымі зернямі, а вось дыетолагі раяць выбіраць крупы з зернямі буйнейшымі. Гатуюцца яны, вядома, даўжэй (прытым, што любыя ячныя крупы даводзіцца доўга варыць), але вугляводаў у іх менш і глікемічны індэкс ніжэйшы.

Абыдзецца паўкіло самых карысных (буйных) ячных круп спажыўцу ў сярэднім у смешную суму 55-59 капеек, 800 г «галандскіх» расійскай вытворчасці будуць каштаваць 1,80, крупы ў пакецiках для варкі — ад 1,50 да 2,32 у залежнасці ад вытворцы.

Дарэчы, пра глікемічны індэкс — ён уплывае на ўзровень глюкозы ў крыві. Большасць круп (у адрозненне ад іншых вугляводных прадуктаў) мае нізкі або сярэдні ГІ (ніжэй за 55 і 55—69 адпаведна). Гэта значыць, пры іх ужыванні ўзровень глюкозы расце павольна і насычэнне будзе доўгім. Яшчэ адна важная характарыстыка круп — наяўнасць або адсутнасць глютэну. Глютэн — гэта бялок збожжавых культур. Сам па сабе ён бясшкодны, але можа выклікаць парушэнне стрававання ў людзей з непераноснасцю глютэну (хоць іх усяго 2 % у свеце). Да безглютэнавых круп належаць, у прыватнасці, грэчка і проса.

**Проса** папулярнасцю сёння не карыстаецца — не ў модзе яно, што зробіш. Купляюць яго ў асноўным маладыя мамы — для малочных або салодкіх каш з разынкамі і курагой. Яшчэ проса часам вараць з гарбузом. Але наогул — не любіць гэтую кашу сучасны спажывец, кажуць прадаўцы. Магчыма, таму, што важдацца з гэтымі крупамі трэба доўга. Напрыклад, вельмі старанна мыць, інакш каша будзе гаркаватай. Кухары сцвярджаюць, што з проса можна гатаваць выдатныя гарніры з агароднінай, і што гэтыя крупы цудоўна спалучаюцца з тлустымі гатункамі мяса. Але купляюць проса сёння нячаста, падзялілася Таццяна.

700 г шліфаванага проса айчыннай вытворчасці каштуюць у сярэднім рубель 65 капеек, паўкіло проса ў пакецiках для варкі — ад 2,90 да 3,93.

### ЗВЫКЛЫЯ

А вось **рыс** — найбольш хадавыя крупы, яны больш зразумелыя сучаснай гаспадыні. Нягледзячы на моду на правільнае харчаванне, найбольш запатрабаваны белы шліфаваны рыс (хоць усе чулі, што вітамінаў і мікраэлементаў у ім мала, а крухмалу шмат, і ён выклікае рэзкі скачок цукру ў крыві). Разнавіднасцяў апрацаванага рысу сёння мноства — доўгі для гарніраў, круглы для галубцоў, спецыяльныя сарты для плову і рызота, прапараны рыс, рыс для сушы і ролаў і г. д. Плюсоў з пункту погляду здароўя ў рысу няшмат, але яны важкія: прадукт паляпшае мазгавую дзейнасць і засцерагае стрававальны тракт, абвалакваючы яго сценкі.

З ЗСЖ-варыянтаў спажыўцу сёння прапануецца **буры (ён жа карычневы) рыс** — неабчышчаныя крупы, у якіх захаваны максімум карысных рэчываў: фосфар, магній, антыаксіданты і вітаміны. Прадукт паляпшае стравнанне, выводзіць солі цяжкіх металаў, зніжае рызыку развіцця артрытаў і захоўвае маладосць скуры. Але патрабуе шматразовага прамывання, замочвання і доўгай варкі. І на смак тое, што атрымліваецца ў выніку, — вельмі на аматара. Таксама з разнавіднасцяў рысу сёння ў модзе **чырвоны** — ён павышае гемаглабін, а самы дарагі — **чорны рыс**, ён жа самы нізкакаларыйны (запавольвае працэс старэння і ўмацоўвае сэрца).

Шліфаваны рыс абыдзецца пакупніку ў суму ад 2,50 да 4 рублёў за 800 г. Прапараны рыс (790 г) кітайскай вытворчасці ў сярэднім каштуе крыху менш за 3 рублі (2,89-2,93), трохі даражэйшы рыс для сушы (650 г расійскай вытворчасці — 2,90). 450 г бурага рысу абыдуцца ў 2,31, а паўкіло чорнага рысу італьянскай вытворчасці можна купіць у «Еўраопце» за 9,99 рубля.

**Грэчка,** як вядома, на постсавецкай прасторы — своеасаблівы індыкатар грамадскіх хваляванняў. Скупляюць грэчку, калі будучыня туманная і палохае. У 2012 годзе, у чаканні канца свету па календары майя, многія нават скептычна настроеныя пакупнікі ўсё ж клалі ў кошык пачак-другі грэчкі на запас. У пачатку пандэміі ў ліку найбольш запатрабаваных прадуктаў была тая ж грэчка. Але чаму менавіта гэтыя крупы (а не супастаўны па цане рыс, напрыклад) сталі ў нашай культуры такой вось лакмусавай паперкай няўпэўненасці ў заўтрашнім дні?

Перш за ўсё, грэчка сапраўды захоўваецца даўжэй за іншыя крупы: цвіль на ёй не з'яўляецца нават пры высокай вільготнасці. Тэрмін захоўвання грэчкі — крыху менш за два гады ў сухім, цёмным, прахалодным месцы. Але, у прынцыпе, у любых умовах яна не страціць сваіх якасцяў каля года. Па-другое, яна сапраўды карысная і можа пры неабходнасці замяніць сабой на нейкі час многія іншыя прадукты, бо змяшчае пратэіны, ненасычаныя тлустыя кіслоты, кальцый, цынк, вітаміны A, групы B, E і PP. Грэчка — адна з любімых каш дыетолагаў (12-14 % бялкоў і ўсяго 3 % тлушчаў), гастраэнтэролагаў (стымулюе перыстальтыку кішэчніка), эндакрынолагаў (ешце грэчку, і ў вас не будзе дыябету) і нават кардыёлагаў (зніжае халестэрын у крыві і памяншае рызыку развіцця гіпертаніі). А яшчэ рэгулярнае спажыванне грачанай кашы паніжае цукар і павышае гемаглабін.

Ну а з пункту гледжання звычайнага спажыўца, які не надта цікавіцца збалансаванасцю свайго рацыёну, грэчка — гэта проста смачна. Яе можна прыгатаваць тысячай і адным спосабам — і з тушонкай, і з падліўкай, і з малаком, і з цукрам. Варыцца яна хутка — дастаткова ўсяго 15 хвілін. Не валодаючы кулінарнымі талентамі, не сапсаваць яе лягчэй, чым, напрыклад, прасяную або ячную кашу. Адсюль лагічна вынікае і яшчэ адна прычына — настальгічная. У савецкіх школьных сталоўках, у піянерскіх лагерах, у сталовых прадпрыемстваў і ўстаноў грэчка заўсёды была «на вышыні»: нават калі ўсё іншае «на троечку з мінусам», грэчка дакладна ядомая. Плюс у 1980—1990-я грэчка была ў дэфіцыце — гэта дадавала ёй прывабнасці. Грэчку бралі з сабой у паходы і на турзлёты. Для «народжаных у СССР» яна мае смак маладосці, лета, адпачынку, бесклапотнасці.

У нашы дні да звыклых ядрыцы і сечкі дадаліся модная ў аматараў правільнага харчавання зялёная (сырая) грэчка, а таксама прапараная грэчка (яна варыцца хутчэй за ўсё). Дарэчы, каб смачна прыгатаваць грэчку, кухары раяць папярэдне абсмажыць крупу ў сметанковым масле пры пастаянным памешванні (5-6 хвілін). Паверхня зерняў карамелізуецца, і каша будзе рассыпістай. Бонус — лагодны сметанковы прысмак.

800 г грэчкі-ядрыцы расійскай вытворчасці каштуюць сёння ад 3,30 да 4,75. Грэчку ў пакецiках выпускаюць з самымі рознымі напаўняльнікамі — ад баравікоў да гародніны. Паўкіло грэчкі ў пакецiках для варкі без напаўняльніка абыдзецца ў 3 рублі з капейкамі.

### МОДНЫЯ

Калумб адкрыў Амерыку толькі ў канцы XV стагоддзя, а на тое, каб заморская бульба стала галоўным гарнірам у Заходняй і Усходняй Еўропе, спатрэбілася яшчэ некалькі сотняў гадоў. Да гэтага людзі ў асноўным у якасці «напаўняльніка» выкарыстоўвалі кашы. У сярэдзіне дваццатага стагоддзя пра крупы, зрэшты, крыху прызабылі. У СССР больш распаўсюджанымі гарнірамі сталі «макарошкі», ну і, зразумела, бульба ў розных відах. Але са з'яўленнем трэнду на правільнае харчаванне кашы трыумфальна вярнуліся ў рацыён сучаснага чалавека. Вылучыліся модныя крупы, якія дыетолагі назвалі суперфудамі — гэта значыць выключна карыснымі для здароўя. Напрыклад, гадоў восем таму ў моду ўвайшлі лацінаамерыканскія крупы **кіноа** — лічылася, што яны неверагодна ўзмацняюць імунітэт і падаўляюць рост ракавых клетак. Не так даўно кіноа была самымі моднымі крупамі ў дыетолагаў селебрыці: не карміць жа іх проста грэчкай?! Сёння мода прайшла: дыетолагі кажуць, што гэта не больш чым магчымасць разнастаіць сваё меню. Зрэшты, каштуе кіноа па-ранейшаму досыць дорага: 6,99 за 450 г круп расійскай вытворчасці, столькі ж за 350 г кіноа з Турцыі.

**Кус-кус** — яшчэ адны модныя крупы. Хоць на самай справе гэта не крупы — прадукт выраблаецца са здробненай пшаніцы цвёрдых сартоў, іншымі словамі, гэта хутчэй макарона. Гатуюць кус-кус на пары. Па смаку ён досыць прэсны. Затое карысны — змяшчае шмат селену, а значыць, з'яўляецца антыаксідантам і падтрымлівае імунітэт.

450 г кус-кусу вытворчасці Туніса каштуюць 2 рублі 99 капеек, 350 г расійскіх круп — 5,75.

**Булгур** таксама бліжэйшы да макароны, чым да кашы. Гэта маладая пшаніца, зярняткі якой ачысцілі і высушылі. Булгур менш каларыйны, чым кус-кус, і змяшчае на сто грамаў больш за 12 г бялку. Прадукт вызначаецца вялікай колькасцю мікраэлементаў (магній, кальцый, калій, жалеза, медзь), вітамінаў (групы B, E, D, A), а таксама вялікай колькасцю харчовых валокнаў. Асабліва карысны для печані: нармалізуе яе работу.

Булгур можна купіць па цане ад 1,99 да 7,95 за паўкіло — у залежнасці ад краіны паходжання.

**Полба** (яна ж спельта, эмер, камут): яшчэ нядаўна гэта было нешта з казак Пушкіна, а цяпер — самы модны гарнір. Полба — збожжавая культура сямейства злакавых, і чалавецтва ўжывала яе як ежу з часоў неаліту. А ў нашы дні адкрывае для сябе зноў, бо новае — гэта добра забытае старое. Полба — прадукт нізкакаларыйны (усяго 127 ккал на 100 г) і пры гэтым высокабялковы (утрымлівае больш за 35 % бялку і па яго колькасці пераўзыходзіць курыныя яйкі), змяшчае ўсе незаменныя амінакіслоты (лікам 18). Вызначаецца надзвычай вялікай колькасцю жалеза, магнію і цынку, а таксама шырокім спектрам вітамінаў. Пішуць, што гэтыя крупы зніжаюць рызыку развіцця анеміі і анкалогіі, павышаюць імунітэт, падтрымліваюць сэрца і нармалізуюць эндакрынную сістэму — словам, усё тое, што 8-10 гадоў таму пісалі пра кіноа. У рэстаранах на хвалі моды з полбы сёння падаюць і хлеб, і супы, і соусы, і дэсерты. Непрафесійнаму кухару з полбы прасцей за ўсё прыгатаваць гарнір — напрыклад, з гароднінай, накшталт рызота. Варыць полбу проста — заліць вадой у прапорцыі 1:2, падсаліць і гатаваць на павольным агні каля 30 хвілін. Папярэдне крупы рэкамендуецца замачыць на гадзіну ў вадзе. Драблёную полбу замочваць не трэба.

Як і любы трэнд, каштуе полба сёння дорага для свайго сегмента. Мы знайшлі варыянты 5 рублёў 59 капеек за 350 г полбы «старарускай» і 6 рублёў 45 капеек за 450 г.

Аляксандра **АНЦЭЛЕВІЧ.**

# Правила проведения РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «Зимняя Додомания»

Настоящие правила проведения рекламной игры «Зимняя Додомания» (далее – Правила) разработаны в соответствии с Положением о проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 № 51 (с изменениями и дополнениями), и определяют порядок проведения рекламной игры «Зимняя Додомания» (далее – Рекламная игра).

**1. Организатор Рекламной игры.**

Организатором Рекламной игры является ООО «ТДИ ПРОМО-ИВЕНТ», Республика Беларусь, 220034, г. Минск, ул. Краснозвёздная, 18б, 2-й этаж, пом. 5, УНП 190771520, зарегистрированное Минским горисполкомом Республики Беларусь решением от 2 ноября 2006 года, в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190771520.

**2. Заинтересованные лица Рекламной игры:**

1) ООО «Пицца Стар», УНП 195454509, Республика Беларусь, 220075, г. Минск, ул. Селицкого, д. 21Б, пом. 2, каб. 56.

2) ЧТУП «Неолинк», УНП 190999301, Республика Беларусь, 220055, г. Минск, ул. Каменногорская, д. 45, офис 203.

3) «Приорбанк» ОАО, УНП 100220190, Республика Беларусь, 220002, г. Минск, ул. В. Хоружей, 31 А.

**3. Участники Рекламной игры.**

К участию в Рекламной игре приглашаются все граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие в Республике Беларусь, иностранные граждане, лица без гражданства, имеющие вид на жительство на территории Республики Беларусь, постоянно проживающие в Республике Беларусь.

К участию в Рекламной игре допускаются физические лица, заказывающие, приобретающие или использующие игровые продукты исключительно для личных, семейных, домашних и иных нужд, не связанных с осуществлением предпринимательской деятельности, отвечающие требованиям Правил на условиях, предусмотренных в Правилах.

Участником Рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства, а также члены Комиссии по проведению Рекламной игры.

**4. Наименование Рекламной игры:** «Зимняя Додомания».

**5. Территория проведения Рекламной игры:** сеть ресторанов быстрого обслуживания «Додо Пицца» на территории Республики Беларусь.

**6. Срок начала Рекламной игры:** 13 января 2022 г.

**7. Срок окончания Рекламной игры:** 31 мая 2022 г.

**8. Наименования товаров (работ, услуг) или их групп, в целях стимулирования реализации которых проводится рекламная игра:**

Рекламная игра проводится в целях стимулирования реализации следующих товаров (далее – «Игровые продукты):

| | |
|---|---|
| 1 | Пицца «Пепперони» (в ассортименте) |
| 2 | Пицца «Карбонара» (в ассортименте) |
| 3 | Пицца «Четыре сезона» (в ассортименте) |
| 4 | Пицца «Аррива!» (в ассортименте) |
| 5 | Пицца «Додо» (в ассортименте) |
| 6 | Пицца «Мясная» (в ассортименте) |
| 7 | Пицца «Цыпленок барбекю» (в ассортименте) |
| 8 | Пицца «Цыпленок ранч» (в ассортименте) |
| 9 | Чизбургер-пицца (в ассортименте) |
| 10 | Pepsi 0,5 л |
| 11 | «Таежный чай» |
| 12 | «Малиновый пунш» |
| 13 | «Додстер» |
| 14 | Рулетики с корицей, 16 шт. |
| 15 | Рулетики с брусникой, 16 шт. |

**9. Призовой фонд Рекламной игры.**

Призовой фонд Рекламной игры сформирован за счет имущества Заинтересованных лиц ООО «Пицца Стар» и ЧТУП «Неолинк», а также денежных средств Заинтересованных лиц ООО «Пицца Стар» и «Приорбанк» ОАО в общем размере 25 092,29 (двадцать пять тысяч девяноста два) белорусских рубля 29 копеек.

Призовой фонд Рекламной игры включает следующие призы:

**Таблица № 1. Призовой фонд Рекламной игры.**

| № | Наименование | Название приза далее в Правилах | Кол-во, шт. | Стоимость за ед., бел. рублей | Всего, бел. рублей | Кем сформирован призовой фонд |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Кресло компьютерное EVOLUTION CONQUEROR BLACK | Кресло 1 | 1 | 708,34 | 708,34 | ЧТУП «Неолинк» |
| | денежные средства | | | 83,43 | 83,43 | ООО «Пицца Стар» |
| 2 | Кресло компьютерное EVOLUTION GLORIOUS черное | Кресло 2 | 1 | 716,66 | 716,66 | ЧТУП «Неолинк» |
| | денежные средства | | | 84,67 | 84,67 | ООО «Пицца Стар» |
| 3 | Кресло компьютерное EVOLUTION OMEGA | Кресло 3 | 1 | 683,33 | 683,33 | ЧТУП «Неолинк» |
| | денежные средства | | | 79,69 | 79,69 | ООО «Пицца Стар» |
| 4 | Кресло компьютерное EVOLUTION RACER | Кресло 4 | 1 | 637,50 | 637,50 | ЧТУП «Неолинк» |
| | денежные средства | | | 72,84 | 72,84 | ООО «Пицца Стар» |
| 5 | Кресло компьютерное EVOLUTION DELTA оранжевое | Кресло 5 | 1 | 641,66 | 641,66 | ЧТУП «Неолинк» |
| | денежные средства | | | 73,47 | 73,47 | ООО «Пицца Стар» |
| 6 | Подставка для ноутбука EVOLUTION LS107 | Подставка для ноутбука | 3 | 97,78 | 293,34 | ЧТУП «Неолинк» |
| 7 | Bluetooth гарнитура EVOLUTION BH510 | Гарнитура | 5 | 47,69 | 238,45 | |
| 8 | Портативная акустическая система EVOLUTION BOOM-101 BLACK | Акустическая система | 2 | 65,00 | 130,00 | |
| 9 | Электрическая (звуковая) зубная щетка EVOLUTION TB-01 | Зубная щетка | 5 | 79,00 | 395,00 | |
| 10 | Увлажнитель воздуха Evolution powered by Deerma F426 | Увлажнитель воздуха | 5 | 66,00 | 330,00 | |
| 11 | Qi беспроводная зарядная станция для джойстиков PS4 FLASHFIRE Qi4-2000 | Зарядная станция | 5 | 82,50 | 412,50 | |
| 12 | Денежный приз в размере 50 белорусских рублей, зачисленный на дебетовую банковскую карту «Яркая карта», эмитированную «Приорбанк» ОАО | 50 BYN | 160 | 50,00 | 8 000,00 | «Приорбанк» ОАО |
| 13 | Денежный приз в размере 500 белорусских рублей, зачисленный на дебетовую банковскую карту «Яркая карта», эмитированную «Приорбанк» ОАО | 500 BYN | 3 | 500,00 | 1 500,00 | «Приорбанк» ОАО |
| | денежные средства | | | 52,30 | 156,90 | |
